# Да мэтодолёгіі гісторыі Беларусі

Сяньня, калі ўсюды на Беларусі маем многа беларускіх па духу школаў, дамоў культуры й іншых культурных установаў, у якіх вядзецца ўзгадаваньне нашага маладога пакаленьня й грамадзянства, трэба зьвярнуць увагу на неабходнасьць аднолітага выкладаньня беларускае гісторыі. На жаль, мы ня маем добрага, падручніка, каторы мог-бы выкарыстаць настаўнік, лектар, ці вучань, а які ў даступны спосаб падаўбы ім асноўныя высновы, да якіх дайшла беларуская гістарычная навука. З гэтага гледзішча вага такіх падручнікаў, як Ластоўскага, Ігнатоўскага, Пічэты й інш. малая, бо гэтыя дасьледчыкі слаба арыентаваліся ў сутнасьці беларускае гісторыі, або былі сьведама змушаны да праводжаньня варожых беларускаму народу тэндэнцыяў. А тым часам аднаіты падход да сваёй гісторыі ёсьць для нас пякучай патрэбай. Нельга ні на хвіліну забывацца, што асновай нацыянальнага беларускага сьветагляду будуць студыі собскай гісторыі. Вось-жа, які гэта будзе сьветагляд, калі кожны настаўнік, лектар, будзе праводзіць набытую ў чужой школе, або скампанаваную на собскі спосаб, тэндэнцыю? Ня будзе сумлеву, што ў гэтым прыпадку мы самі сябе адсунем ад таго жарала духовае сілы, якую нам дае наша гісторыя. А гэта было-б вялікім мінусам у нашай сучаснай нацыянальнай працы.

Заданьнем гэтага артыкулу ёсьць прадставіць асноўныя вехі і факты нашага гістарычнага разьвіцьця ў сьвятле беларускіх гістарычных досьледаў. Гэтых тэзаў трэба трымацца, фактычны матарыял можа быць узяты зь першага лепшага падручніка.

**1. Паходжаньне беларускага народу**

Выясьняючы гэтае пытаньне, трэба ведаць, што паходжаньне беларускага народу ёсьць нячыста славянскае, а мяшанае. Перад прыходам у Беларусь славянскіх беларускіх плямёнаў, яе насялялі ценькай прасланьню г. зв. балты, а на поўначы часткава фіны. Гэты субстрат растапіўся ў славянскім беларускім элемэньце, але пакінуў шмат сваіх астачаў так у нашай духовай, як матарыяльнай культуры. Пад напорам беларускіх славянскіх плямёнаў балты часткава падаліся на поўнач, дзе зьмяшаліся зь фінамі й гэткім

парадкам паўсталі сяньняшні жмудзкі й латыскі народы. Народу, які мог-бы сяньня ўважаць сябе за прадстаўніка чыстых балтаў, няма. Ды культуры й наагул мінуўшчыны балтаў сяньня маюць прэтэнзіі і беларусы, і жмундзіны, і латышы кажны ў сваім засягу. Калі скончыўся працэс поўнага растапленьня балтаў у Беларусі ў славянскім беларускім элемэньце, сказаць трудна. Аўтар уважае, што канцом яго трэба лічыць канец XIII ст.

Гаворачы аб беларускіх славянскіх плямёнах трэба да іх залічаць нятолькі крывічоў, радзімічаў і дрыгавічоў, але северанаў, вяцічаў і драўлянаў. Што да першых трох — дык справа ясная, што да северанаў і вяцічаў, дык тут маем нятолькі сьвядоцтва летапісца (радзімічы, северане, вяцічы «один обычай имяху»), але і грунтоўную працу праф. Растаргуева; што да драўлянаў — дык апрача іхняе мінуўшчыны іхнюю беларускасьць сьвярджаюць навейшыя досьледы й між імі ўкраінца Ганцова.

## 2. Падзел гісторыі Беларусі на пэрыёды

Хоць гэтае пытаньне мае больш мэтодолёгічны характар, але пэрыёдызацыю собскае гісторыі павінен ведаць кажны беларус. Падзел гісторыі на пэрыёды — гэта касьцяк, фундамэнт будовы самое навукі, сынтэза гісторыі. Даты, аддзяляючыя пэрыёды — гэта паваротныя вехі ў жыцьці народу. Можна забыцца аб фактах, але аб гэтых паваротных мамэнтах трэба ведаць.

Ні ў якім прыпадку ня будзе дапушчальным тасаваньне старога падзелу гісторыі Беларусі на гэткія пэрыёды, як «полацкі», «літоўскі», «польскі», «расейскі» і хто ведае яшчэ які. Гэты падзел у сваіх асновах фальшывы. Ён прадстаўляе наш народ у мінуласьці як аб’ект, а не як суб’ект, што зусім не адказвае гістарычнай праўдзе. Якой-бы багатай і слаўнай ня была мінуўшчына народу, ўцісьненая у гэткую «пэрыёдызацыю» яна будзе ад пачатку прадстаўлена ў фальшывым аспэкце. Аўтар гэтага артыкулу ў працы «Перыёдызацыя гісторыі Беларусі» абасноўвае наступны падзел на пэрыёды нашае гісторыі:

I. Пэрыёд асобных беларускіх гаспадарстваў (да паловы XШ ст.).

II. Пэрыёд суцэльнага беларускага гаспадарства (ад паловы XШ ст. да канца XVII).

KAMUNIKAT.org

Ш. Пэрыёд заняпаду беларускае гаспадарсьцьвенасьці (ад канца XVII ст.).

У першых двух Беларусь жыла незалежным гаспадарсьвеным жыцьцём і была суб'ектам у эўрапэйскіх адносінах, у трэцьцім пад польскай і маскоўскай няволяй.

Трэба тут падчыркнуць, што думку аб гэтым падзеле гісторыі Беларусі на пэрыёды знаходзім і ў праф. Доўнар-Запольскага ў ягонай працы "Асновы гаспадарсьвенасьці Беларусі" і М. Шчакаціхіна «Гісторыя беларускага мастацтва». Праўда, яна ня выказана там выразна, але сама сабой выплывае. Дык няма патрэбы трымацца старога, фальшывага падзелу, каторы нічога не выясьняе, а толькі ўсё зацемняе.

Гаворачы аб першым пэрыёдзе, трэба зьвярнуць аднолькава важную ўвагу як на Полаччыну, так на Смаленшчыну. Нельга абмінуць і гісторыі тых гаспадарстваў княстваў, каторыя з прычыны эканамічных, ды іншых адносінаў, лучалі на даўжэйшы час у палітычную залежнасьць ад небеларускіх цэнтраў, напр. Чарнігава-Севершчына, Псковшчына. Асабліва культурныя здабычы Смаленшчыны павінны быць падчыркнены, бо яны сапраўды, былі вялікімі.

**ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ (БЕЛАРУСКАЕ)**

Пераходзячы да агляду другога пэрыёду беларускае гісторыі, трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на п а ў с т а н ь н е Вялікага Княства Літоўскага. Тады нам будзе ясным, што гэтае гаспадарства ад свайго пачатку было беларускім, і толькі таму ў ім панавала беларуская культура, беларуская мова, звычаі, асновы гаспадарсьцьвенага ладу, палітыка, а ня дзякуючы таму непраўдападобнаму факту, што беларуская культура зь «цягам часу» перамагла, што нейкія мітычныя заваёўнікі нас падбілі, стварылі так магутны гаспадарсьцьвены арганізм, а потым самі пырснулі як мыльныя бурбалкі. Трэба ведаць, што калі-б гаспадарсьцьвены арганізм Вялікага Княства Літоўскага быў збудаваны не беларускімі, а іншымі рукамі, дык нашая культура ў ім напэўна — бы не перамагла, як у падобных выпадках не перамагала нідзе культура падбітага народу. Не магло быць цудаў і ў нас.

Але калі толькі належна прадставіць гістарычныя факты штода ўтварэньня Вялікага Княства Літоўскага, дык кажнаму будзе



kamunikat.org

ясным, што гэта гаспадарства было беларускім ад пачатку. Як гэтыя факты выглядаюць?

Вось-жа Вялікае Княства Літоўскае было заложана Міндаўгам, у сярэдзіне ХШ ст. Тады яно ахапляла толькі беларускія землі — Наваградчыну, Слонімшчыну, Горадзеншчыну і Ваўкавышчыну. З гэтуль экспансія маладога княства йшла на поўнач (жмудзкія землі, або сяньняшняя этнаграфічная Летува), на ўсход (крывіцкія землі), поўдзень (рускія). У той час, калі экспансія на крывіцкія землі адбывалася бесьперашкодна й гэтыя землі дабравольна далучаліся адна за другой да нарастаючага палітычнага твору, жмудзкія, або этнаграфічна-летувіскія былі далучаны да новага гаспадарства сілай. Ведама, што зь беларускіх земляў князь Міндаўг рушыў у 1264 ці 1263 г. на падбой Жмудзі. Як падае летапісец, ён яму ўдаўся, хоць сам Міндаўг у гэтай барацьбе зьгінуў.

Далучэньне этнаграфічна-летувіскіх земляў да новага гаспадарства вельмі павялічыла ў ім этнаграфічна-летувіскі элемэнт. Можна нават казаць, што калькасна ён мала ўступаў беларускаму. Ёсьць гістарычныя дадзеныя, што між беларускім і летувіскім элемэнтамі пачалася барацьба за кіраваньне новым палітычным арганізмам. І няведама, якой была-б яго доля, калі-б на гістарычную арэну ня выступіла вялікая ў нашай гісторыі асабістаць — князь Войшалак, сын Міндаўга. Як падае летапісец, ён удаўся ў Жмудзь з жаданьнем памсьціць сьмерць свайго бацькі, — князя Міндаўга. Меў ён толькі беларускую дружыну і ў кароткім часе вярнуў на Жмудзі парадак, «ізбіяху» там як кажа летапісец, вялікае «множество» ворагаў. Гэтым была адсунена назаўсёды небясьпека апанаваньня гаспадарства этнаграфічналетувіскім элемэнтам. Гэтым было запэўнена панаваньне беларускіх нацыянальных (паколькі да тых часоў можна, наагул, адносіць гэтае паняцьце), культурных, палітычных і эканамічных асноў у новым гаспадарсьцьве.

Ад Войшалка беларускі характар Вялікага Княства Літоўскага не падлягае ўжо ніякаму сумлеву, хоць для нас ясным ёсьць беларускі яго характар і за Міндаўга, калі гаспадарства абыймала толькі беларускія этнаграфічныя землі.



KAMUNIKAT.org

На гэты факт трэба зьвярнуць вялікую ўвагу, а забытую, накрытую пылам стагодзьдзяў асабістасьць Войшалка падняць да ролі найвялікшага героя нашае мінуўшчьны, якім ён і быў у запраўднасьці, хоць даканаўшы свайго вялікага чыну, дабравольна пайшоў у манастыр, у якім быў і перад дакананьнем гэтага чыну!

**ТЭОРЫЯ ЗАВАЯВАНЬНЯ**

Паміма вышменаваных ясных гістарычных фактаў, варожая нам гісторыёграфія польская і маскоўская кіруючыся выключна палітычнай тэндэнцыей, пераіначвае гістарычную праўду. Яна разьдзьмухвае выдуманую празь сябе г. зв. «тэорыю заваяваньня» беларускіх земляў этнаграфічнымі летувісамі (жмудзінамі). Апіраецца яна на перададзеных летапісцам адзіночных, хоць у значнай колькасьці, фактах разбойніцкіх нападаў дробных летувіскіх князькоў на беларускія княствы. Досыць было дзесь паказацца дзесятку летувіскіх разбойнікаў, як ужо цэлая, часам вялізарная (як Смаленшчына, ці Полаччына) землі былі імі «заваяваны». Мы не пярэчым, што гэтыя напады былі, але апрача разбойніцкага, яны ня мелі ніякага іншага характару. Гэтыя напады ніколі ня мелі гаспадарсьцьвена — творчае тэндэнцыі, бо гаспадарсьцьвеная форма жыцьця тады ня была ведама летувісам. Яны былі ўсё яшчэ на прымітыўнай ступені пляменнага разьвіцьця. Дык як яны маглі тварыць гаспадарства ў нас? Беларуская форма гаспадарсьвенага жыцьця была ўводжана на Жмудзі, пачынаючы ад Міндаўга, але канчальна беларускія парадкі завёў там Гедымін. Адваротны працэс ніколі ня меў месца.

Тэорыя заваяваньня парэчыць усім гістарычным жаролам. Гісторыкі, што яе трымаюцца, ня могуць знайсьці ніводнае «пэўнае» даты, калі паасобная беларуская зямля была «заваявана». У кажнага зь іх гэтыя даты выглядаюць накш. А чаму? Бо яны выімагінаваныя, гістарычныя жаролы іх не перадаюць. Летапісец перадаў нам толькі вышменаваныя, нічога нязначыўшыя грабежніцкія напады летувісаў і факты, ілюструючыя арганізацыю Вялікага Княства Літоўскага, якія сьветчуць, што гэтае гаспадарства было беларускім, ад самага свайго пачатку.

На гэтай аснове немагчыма нам паўтараць гэтыя выдуманыя варожай гісторыёграфіей байкі, пярэчучыя гістарычным жаролам і маючыя выключна палітычную, мэту — паніжэньне гістарычнае

kamunikat.org

ролі беларускага народу, выясьненьне, што гэты народ быў «нягістарычным». Паўстаньне Вялікага Княства Літоўскага павінна быць выясьнена так, як пададзена вышэй, як аб гэтым гавораць крыніцы.

## ПРАЦЭС ДАЛУЧЭНЬНЯ БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯЎ

Толькі беларускі характар новага гаспадарства выклікаў цікавасць да вольнага далучэньня да яго беларускіх земляў. З аднаго боку магутны палітычны, культурны і рэлігійны ўздым беларускага жыцьця ў ім, а з другога — татарская небясьпека, узрастаўшае пачуцьцё нацыянальнае, рэлігійнае і культурнае салідарнасьці, выклікалі факты, што паасобныя беларускія княствы адно за адным аддаваліся ў ваенную апеку вялікага князя, захоўваючы ў сябе ўсе парадкі пастарому. З свайго боку вялікія князі заўсёды падчырквалі, — «мы старыны ня рухаем, навіны ня ўводзім». Гэтага ня трэба разумець, як нейкага обскурантызму, а толькі як глыбокую палітычную мудрасьць асновапаложнікаў суцэльнага беларускага гаспадарства, умеўшых шанаваць мясцовыя звычаі й гістарычныя асаблівасьці кажнае зямлі. Паступова, шляхам сужыцьця, усе беларускія землі злучыліся ў вялікае фэдэрацыйнае беларускае гаспадарства. Немагчыма дакладна ўстанавіць датаў, калі кажнае княства увайшло ў склад гэтага гаспадарства. Толькі прыблізна можна іх вылічыць.

У некаторых землях, як прыкладам у Смаленшчыне, частка насельніцтва бунтавалася супроць далучэньня. Але больш уплывовыя колы былі за далучэньнем, што пры Вітаўце канчальна й наступіла.

Адзіночных выпадкаў апору супроць далучэньня да суцэльнага беларускага гаспадарства, якія дзе-ня-дзе мелі месца, ні ў якім вытадку няможна разглядаць, як абарону «гінуўшай» беларускай «незалежнасьці», як гэта робяць некаторыя нашыя гісторыкі, а толькі як праявы лёкальнага шкоднага сэпаратызму, падтрымоўванага ці то мясцовымі пакрыўджанымі князямі, ці некаторымі пpoсланямі жыхарства, выражаўшымі незадаволеньне новымі парадкамі. Сутнасьць гісторыі Беларусі трэба бачыць у гэтую пару ў працэсе задзіночаньня гаспадарства, а не ў адцэнтральных адскоках, хоць яны ясна такжа ўваходзяць у нашую гісторыю.

KAMUNIKAT.org

## НАЗОЎ ЛІТВА, ЛІТОЎСКІ

Сяньня трэба лічыць даказаным, асабліва пасьля грунтоўна абаснаваных мяркаваньняў з гэтага гледзішча праф. Лаўмянскага (Studia nad społeczeństwem i państwem litewskim), што першабытны назоў «Літва» адносіўся тэрытарыяльна да зямлі між Вяльлёй і Нёманам, этнаграфічна беларускай, дзе нарадзілася гаспадарства Міндаўга. Чый гэта быў назоў — няведама. Ані беларуская, ані летувіская а тымбалей латыская мова этымолёгічнага значэньня гэтага слова выясьніць ня могуць. Ды і гэта няважна. З тэрытарыяльным пашырэньнем Вялікага Княства шырыўся й гэты назоў. Спачатку ён азначаў гаспадарсьцьвенную прыналежнасьць, а потым стаўся нацыянальным назовам нашага народу. Нятолькі асьвечаныя клясы нашага народу называлі сябе Ліцьвінамі, але назоў гэты пранікаў у шырокія народныя гушчы. З астачамі гэтага зьявішча спатыкаліся дасьледчыкі яшчэ зусім нядаўна, нават на ўсходнім беларускім Палесьсі тады, калі ўжо, здаецца, непадзельна панаваў наш новы нацыянальны назоў — Беларусы! Само сабой зразумела, што ён у гаспадарсьцьвенным сэньсе ахапіў і жмудзінаў. Але тасаваўся ён наўперад да беларусаў і іхняга гаспадарства. Яшчэ за Казімера Ягайлавіча, жмудзіны чуліся чужымі і гэтаму назову й літоўскай гаспадарсьцьвенасьці калі ўпорыста дамагаліся, каб у грамаце жмудзкай зямлі Казімер абавязкава ўставіў зацемку, што Жмудзь не аружжам была далучана да літоўскага гаспадарства (што ў сутнасьці адказвала праўдзе), а дабравольна (што ўжо не адказвала ей). Гэткім чынам яны яшчэ ў XV ст. проціставіліся літоўскаму элемэнту як чужому, хацелі толькі сужыцьця зь ім і загварантаваньня сабе некаторых праў, але не ідэнтыфікавалі сябе зь ліцьвінамі. Гэты назоў мы павінны разглядаць як наш нацыянальны, выціснуўшы слаба яшчэ пашыраны ранейшы крывічы, а заменены потым беларусамі.

Таму найвялікшай недарэчнасьцю ёсьць ідэнтыфікаваньне яго з сучаснымі назовамі «летувіс», «Летува», што наглядаецца практычна ў некаторых гісторыкаў у тасаваньні гэткіх бяссэнсоўных, прыкладам, выражэньняў, як — «Літоўска-беларускае княства», або «Літоўска-рускае княства» і г.д., чым зіначваецца значэньне слова ”літоўскі”. Вялікае Княства Літоўскае ніколі нямела гэткага падвойнага назову, ніколі ня было нейкім

KAMUNIKAT.org

супольным творам летувісаў і беларусаў, а толькі творам гістарычных ліцьвіноў, г. зн. беларусаў. Таму дзеля паясьненьня беларускага характару назову «літоўскі» можна дадаць у дужках «беларускі», але ніколі ня лучыць гэтых словаў лучнікам. Паўстала гэткае недарэчнае лучэньне зь лёгкае рукі чужое гісторыёграфіі, якая, прыймаючы тэорыю заваяваньня беларускіх земляў, але зноўжа бачучы беларускі характар гаспадарства, пачала ўжываць тэрмін «літоўска-рускі», а ўжо мы яго папраўлілі на «літоўска-беларускі».

Факт, што сягоньня гэты назоў прысабечаны жмудзінамі і мы да іх яго толькі тасуем, ня можа мець ніякага значэньня, бо тыя ці іншыя сучасныя палітычныя меркаваньні ня могуць пераіначваць нашае гісторыі.

## ДЫНАСТЫЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

Мноства летапісаў цьвердзіць, што дынастыя Вялікага Княства Літоўскага была полацкага паходжаньня, і пробуюць нават падаць радаводы яе ад полацкіх князёў.

Мы трымаемся пагляду, што яна была мяшанага, балтыцка-полацкага паходжаньня, аб чым сьветчаць хоць-бы балтыцкія ймёны першых вялікіх князёў. Род іх выводзіўся, бязумоўна, з тых першабытных Балтаў, каторыя растапіліся ў беларускім славянскім элемэньце, творачы субстрат беларускае нацыі. Пазьней прыйшла полацка-крывіцкая дамешка. Гэтая дынастыя ня прыйшла да нас з Жмудзі, як стараліся некаторыя гісторыкі, прыхільнікі тэорыі заваяваньня, безрэзультатна даказаць, а была мясцовага паходжаньня.

Яе валаданьні знаходзіліся там, дзе паўстала гаспадарства Міндаўга, г. ё. у Беларусі, а ня дзесь на Жмудзі, як гэта безрэзультатна выводзілі некаторыя прыхільнікі тэорыі заваяваньня, а між імі ўжо ўспомнены Лаўмянскі.

У жылах вялікіх князёў цякла балтыцкакрывіцкая кроў, гэта ня была дынастыя чужого беларусам паходжаньня. Культурна яна, была беларускай ужо ад пачатку гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Балтыцкі элемэнт у ёй да гэтага часу ўжо поўнасьцю растапіўся ў славянска-крывіцкім. Так Войшалак, сын Міндаўга — першага ведамага нам закладчыка Вялікага Княства, культурна быў ужо поўнасьцю крывічом.



kamunikat.org

На асаблівуго ўвагу заслугоўвае вялікая палітычная мудрасьць, такт, ды патрыятызм першых вялікіх князёў, зьбіральнікаў беларукіх земляў. Ідучы да вялікае мэты задзіночаньня ўсіх крывіцкіх земляў у адно гаспадарства, яны, ведаючы мясцовыя палітычныя й культурныя традыцыі, тасавалі сродкі, каторыя мы сяньня можам азначыць як адзіна правільныя. Былі гэта сродкі процілежныя тым, якія тасавалі вялікія князі маскоўскія. У той час, калі там задзіночаньне наступала шляхам пашырэньня цэнтралізацыі й абсалютнае ўлады вялікага князя, літоўскія (крывіцкія) князі аб'еднавалі беларускія землі, толькі на прынцыпе дэцэнтралізацыі. Згэтуль у Беларусі паўстаў так апрычоны ад маскоўскага нутраны лад у гаспадарсьцьве.

Закладчыкі гаспадарства ад Міндаўга да Вітаўта адзначаліся вельмі шырокім палітычным, крывіцкім, гарызонтам. Імкнуліся яны нятолькі да задзіночаньня беларускіх земляў, але наглядаючы ўзрост Вялікага Княства Маскоўскага, у якім бачылі крывіцкага непрыяцеля, хацелі забясьпечыць гегэмонію Крывіі на Ўсходзе. Ад Міндаўга да Вітаўта палітычная думка вялікіх князёў ёсьць усьцяж ськіраванай на Усход. Толькі пасьля сьмерці Вітаўта Вялікае Княства рэзыгнуе з сваей экспапсыўнай палітыкі на Усходзе й займае тут абаронную пазыцыю.

Побач з шырокімі палітычнымі плянамі ўжо першыя князі разьвіваюць глыбока абдуманую рэлігійную палітыку, апёртую на чыста крывіцкіх асновах. Так ужо Гедымін, аб «паганьсьцьве» якога выдумана столькі баек, устанаўляе першую беларускую мітраполію, незалежную ад Кіева й Масквы. А ведама, што рэлігійная незалежнасьць вяла тады і да культурнанацыяналынай, бо культурна-нацыянальнае жыцьцё, нават у гэтых часох, цесна перапляталася з рэлігійным.

Так-жа дзякуючы палітычнаму розуму першых вялікіх князёў мы заўдзячваем факт, што ў новым гаспадарсьцьве прынялася за ўрадавую мову не лаціна, як усюды на захадзе, а крывіцкая мова. Слабая тэндэнцыя да ўвядзеньня ў нас лаціны, якая праяўлялася ў некаторай ступені за Міндаўга й Гедыміна, дзякуючы іхнім зносінам з Рымам, хутка зчэзла і ўжо пры Альгердзе крывіцкая мова становіцца канчалына ўрадавай.

Ад Ягайлы вялікія князі літоўскія стаюцца адначасна (хоць былі й выняткі) каралямі Польшчы. Злучыўшы ў сабе гэтыя дзьве годнасьці, яны, аднак, перасьцярагалі апрычонасьці Вялікага Княства, што рабіў нават апошні прадстаўнік гэтай дынастыі Жыгімонт Аўгуст III. Характэрна, што пара панаваньня ў Польшчы гэтай крывіцкай дынастыі належыць да пары найвялікшага яе росквіту.

Гаворачы аб наступніках Ягайлавічаў на вялікакняскім пасадзе трэба мець наўвеце, што гэта былі ўжо поўнасьцю чужнікі, якія мала нават арыентаваліся ня то што ў нашых, але й польскіх справах. Зь іх на асаблівую ўвагу заслугоўвае вялікі князь Сьцяпан Батура, які, апіраючыся на літоўскія (крывіцкія) сілы, закончыў памысную для Вялікага Княства вайну з Масквой.

**НУТРАНЫЯ ПАДЗЕІ Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ**

Зусім зразумелым ёсьць, што й пасьля задзіночаньня ўсіх беларускіх земляў у адным гаспадарсьцьве наглядаліся час ад часу адцэнтральныя тэндэнцыі, выступаўшыя асабліва моцна там, дзе былі й багатыя лёкальныя палітычныя традыцыі. Наглядаліся глыбейшыя рухі, меўшыя сацыяльную аснову. Былі паважныя забурэньні рэлігійнае натуры і т. д. Падобныя зьявішчы здараліся і ў кажным іншым гаспадарсьцьве. У той, аднак, час, калі ў гэтых іншых гаспадарствах гісторыёграфія апрацавала адналіты, уласьцівы, падход да гэтых зьявішчаў — у нас, дзякуючы расейскім і польскім уплывам, з гэтага гледзішча ўсё яшчэ пануе анархія. У нас можна напр. часта спаткацца з паглядам, што выступленьне Швідрыгайлы — гэта спроба ўзнаўленьня «незалежнасьці» беларускага гаспадарства, што казацкі рух XVII ст. спроба тэй-жа натуры й т. п. Гэткі падход ёсьць у аснове фальшывы. У гэтым прыпадку вырываецца з агульнае цэласьці адно чыста лёкальнае зьявішча, беспадстаўна глёрыфікуецца і процістаўляецца ўсей іншай беларускай гісторыі, як чамусьці варожаму. Адзіна правільным падходам беларускага гісторыка будзе той, які разглядае цэласьць зьявішчаў як сваё, беларускае, а толькі кваліфікацыю іхняе дадатнае, ці ад'емнае, патуры ўзалежняе ад таго, ці гэтыя зьявішчы разбуралі беларускі гаспадарсьцьвенны арганізм, ці памагалі яго захаваньню, або напраўлялі ў ім той ці іншы бок жыцьця. Дзеля таго да беларускае



KAMUNIKAT.org

гісторыі будзе аднолькава належаць і паўстаньне Швідрыгайлы (nota bene па сацыяльнай аснове) і акцыя супроць яго Жыгімонта I; казацкія паўстаньні XVII ст.  і акцыя супраць іх Яна III Радзівіла, які гэтыя паўстаньні зьліквідаваў. Падобных прыкладаў можна назваць больш, але хопіць і гэтых. Істота беларускае гісторыі будзе, аднак, не ў паўстанні Швідрыгайлы, ці казацкіх паўстаньнях, а ў проціакцыях Жыгімонта I, ці Яна Радзівіла, каторыя баранілі адзінства гаспадарства. Можна мець вялікія сымпатыі, скажам, да казацкіх паўстаньняў, але нятрэба забывацца, што гісторыя Беларусі ў другім пэрыёдзе (пара Вялікага Княства Літоўскага) мела, калі так выразіцца наскрозь «арыстакратычны» характар і тое, што зрабіла гэтая арыстакрацыя ёсьць дэцытуючым, а ня розныя лёкальныя рухі. І рэакцыя апошніх будзе тады толькі дадатнай, калі яны выклікаліся зьявішчамі, якія дзеля дабра гаспадарства, павінны былі быць зьменены, зрэфармаваны. Стрыжанём нашае гісторыі аднак гэтыя адцэнтральныя, ці іншае натуры лёкальныя зьявішчы, паколькі яны не зрабілі перавароту ў гаспадарсьцьве, ніколі быць ня могуць.

З тэй самай прычыны робіцца памылка, калі, прыкладам, усіх гаспадароў, пачынаючы ад Ягайлы разглядаюць як польскіх каралёў, падчыркваючы наўперад гэты іхні тытул, а зусім, або блізу зусім, замаўчваючы другі й для нас уласьцівы іхні тытул — вялікіх князёў літоўскіх (беларускіх). Мы павінны якраз гэты другі іхні тытул заўсёды ставіць на першым месцы, а польскі разглядаць як пабочны, нас куды менш інтарасуючы. Шмат здаралася ў гісторыі выпадкаў пэрсанальнае вуніі, пры захаваньні незалежнасьці злучаных ёю гаспадарстваў, але няма выпадку, каб дзесь на першы плян высоўваўся тытул, які гаспадар — ужываў як рэпрэзэнтант і ўладар другога, чужога гаспадарства. І нам трэба, гаворачы аб нашых гаспадарох, высоўваць на першы плян іхні тытул вялікіх князёў, якім яны карысталіся ў адносінах да нас, да беларускага гаспадарства, а тытул польскіх каралёў разглядаць,  як дадатак, мо й ганорны, але нас мала інтарасуючы.

**ВОНКАВЫЯ АДНОСІНЫ**

На правільнае ўняцьце вонкавых адносінаў Беларусі да сваіх суседзяў трэба зьвярнуць вялікую ўвагу. Гэта патрэбна перадусім дзеля таго, каб належна зразумець сутнасьць вонкавае палітыкі

Беларусі ў мінуўшчыне. І з гэтага гледзішча, дзякуючы варожай нам гістарычнай літаратуры, паўстала вялікая блытаніна, каторая нятолькі зацямняе запраўдную палітычную думку нашых продкаў, але, наагул, усю гісторыю Беларусі прадстаўляе ў фальшывым аспэкце, як мо пры ніякай іншай нагодзе.

Так што да вонкавай палітыкі Беларусі ў першым пэрыёдзе расейская гісторыёграфія тасуе зусім няправільны падход. Разглядаючы беларускі народ як галіну адзінага рускага народу, які стварыў адзінае рускае гаспадарства — Кіеўскае княства, расейская гісторыя разглядае заўзятую барацьбу Беларусі з гэтым гаспадарствам як нейкае «хатняе» непаразуменьне ў «аднэй» славянскай, рускай сям'і. Як асноўны матыў гэтае барацьбы яна падае незадаволеньне крывіцкіх князёў з таго, што іх «пакрыўдзілі» у правох на заняцьце вялікакняскага кіеўскага пасаду. Імкнучыся, быццам, паправіць гэтае палажэньне, крывіцкія князі вялі змаганьне зь Кіевам. Гэтае змаганьне аднак, — цьвердзіць ра-сейская гісторыёграфія — непавінна быць разгляданым як процістаўленьне крывіцкага народу (які, наагул, не йснаваў!) рускаму (расейскаму), а толькі як «спрэчкі» у абрубе аднэй вялікай рускай сям'і.

Няма больш фальшывай тэзы, як падобнае цьверджаньне. Праўда, некаторыя беларускія княствы, а нават Смаленшчына, былі ўцягнуты ў слабую палітычную сувязь зь Кіевам і пакуль у ёй знаходзіліся, не адыйгрывалі ў беларускім палітычным жыцьці выдатнейшае ролі. Зь цягам часу яны вызваліліся ад кіеўскіх уплываў. Але ня ў гэтым справа. Сутнасьць справы палягае на тым, што крывіцкія полацкія князі, якія якраз вялі гэтую барацьбу і ў тагачасным беларускім жыцьці адыйгрывалі павадырскую ролю, не хацелі нічога супольнага мець зь кіеўскім вялікакняскім пасадам! Нават тады, калі кіеўскае насельніцтва, як у выпадку з Усяславам Чарадзеям, дабравольна выбірала на гэты пасад полацкага князя, ён не хацеў на ім заставацца й пры першай нагодзе яго пакінуў.

Істота адносінаў зь Кіевам палягае не на спрэчках «хатняга» характару, а на тым, што на крывіцкай зямлі, як цьвердзяць аб'ектыўныя дасьледчыкі, вытварыўся апрычоны з гледзішча этнаграфічнага, эканамічнага, лінгвістычнага й культурнага гаспа-



KAMUNIKAT.org

дарсьцьвены (палітычны) цэнтр, каторы ў сваіх адносінах з суседзямі, кіраваўся інтарэсамі гатага цэнтру, а не якімісь «крыўдамі» пры падзеле супольнага майна. На гэты мамэнт неабходна зьвярнуць увагу й толькі з гэтага гледзішча выясьняць стогадовае змаганьне Полацка зь Кіевам.

Калі йдзе аб адносіны зь іншымі суседзямі ў першым перыёдзе, дык трэба падчыркнуць палітычныя й культурныя ўплывы крывічоў па балтыцкія народы. Яны знаходзіліся ў палітычнай залежнасьці ад Полацка ўжо ад паловы XII ст. Што датычыць адносінаў з Масквой і Польшчай, дык яны ў першым перыёдзе не адыйгрывалі ніякае ролі.

У другім пярыёдзе гісторыі Беларусі адносіны з суседзямі вельмі скамплікаваліся. І што да гэтага пэрыеду тэндэнцыйная чужая гісторыёграфія ймкнецца прадставіць іх у фальшывым аспэкце. Асноўнай тэзай, праводжанай расейскай афіцыяльнай гісторыей ёсьць даказаць, што беларускі народ, апынуўшыся ў межах Вялікага Княства Літоўскага, апанаваўшы яго культурна, ня меў варожай Маскве палітычнай думкі, а як праваслаўны, імкнуўся да злучэньня зь ёй, усе-ж варожыя выступленьні Вялікага Княства супроць Масквы былі кіраваны «Літвой», а пазьней Польшчай. З другога боку польскія гісторыкі, апіраючыся на фактах шмат разоў заключаных між Польшчай і Вялікім Княствам Літоўскім вуніяў і падмацоўваючы іх рэлігійнымі, культурнымі й палітычнымі ўплывамі, што йшлі ў Літву з Польшчы, намагаюцца даказаць, што асноўнай палітычнай думкай, панаваўшай у гэтым суцэльным беларускім гаспадарсьцьве было злучэньне з Польшчай, разыходзілася толькі аб «лепшыя» варункі гэтага злучэньня. Неабходна выясьніць захопніцкую падкладку гэтых цьверджаньняў польскай і расейскай гісторыёграфіі. У гэткі спосаб яны абасноўваюць «маральнае» права палякоў і расейцаў на беларускія землі й наагул на ўсю самастойную мінуўшчыну Беларусі, якую разглядаюць толькі як свайго роду размавітасьць сваей. Зьвяртае ўвагу факт, што ўсе мамэнты зь гісторыі Беларусі, каторыя запярэчваюць гэтым тэзам, проста замаўчваюцца. Аб іх ніхто, узгадаваны ў польскай ці расейскай школе, нічога ня чуў.

kamunikat.org

Калі мы хочам схарактарызаваць адносіны Беларусі да сваіх суседзяў у гэтым пэрыёдзе, накш кажучы тагачасную вонкавую палітыку Беларусі, дык трэба заўсёды мець на ўвеце, што ніякія прыпадкі, сымпатыі, ці аптыпатыі, ня йгралі тут ролі, а менаваныя адносіны фармаваліся выключна пад кутом гледжаньня пашырэньня ці абароны палітычных інтарэсаў Беларусі, як незалежнага гаспадарства. Гэтая тэндэнцыя ў вонкавай палітыцы Вялікага Княства выступае вельмі выразна, яе ня трэба спецыяльна шукаць. Толькі ёю тлумачыцца факт шматвяковага існаваньня гэтага спадарства, бо калі-б яе ня было дык у тых палітычных умовах, у якіх існавала Вялікае Княства, яно-б развалілася ў сваім жа пачатку.

Пасьля выясьненьня тых нацыянальных, культурных і палітычных асноў, на якіх было збудавана Вялікае Княства Літоўскае, мы прыймаем як факт сам праз сябе зразумелы, што вонкавая палітыка Вялікага Княства мела выключна беларускі характар, што наяўнасьць у гаспадарсьцьве іншых нацыяналынасьцяў, прыкладам жмудзінаў, або накш летувісаў, не ўплывала ні ў якой ступені на беларускі характар гэтае палітыкі. У ёй мы бачым тыя-ж тэндэнцыі, што і ў першым пэрыёдзе. Больш таго — сучасны беларускі нацыянальны рух з палітычнага гледзішча базуецца на тых самых асновах, на якіх будавала свае адносіны да суседзяў Вялікае Княства, мае тыя самыя мэты. Само сабой зразумела, што палітычны сьвет вонках нас сяньня выглядае накш і практычныя нашыя шляхі могуць накш бегчы, але асноўная думка — завядзеньне ў Беларусі беларускіх нацыянальных, культурных, гаспадарскіх і палітычных асноў жыцьця на ўсім яе этнаграфічным прасторы й абарона гэтых асноў на ўсім гэтым-жа абшары ад захопніцтва звонку застаецца тэй самай. Гэты мамэнт заслугоўвае на асаблівае падчыркненьне, бо ён устанаўляе вяковыя традыцыі нашага адроджанага нацыянальнага жыцьця, стварае для яго вялікія гістарычныя фундамонты, легітымуе яго перад чужынцамі. Мы зацемілі, што ў другім пэрыёдзе адносіны з суседзямі скамплікаваліся. На ўсходзе й захадзе вырасьлі новыя сілы, якіх раней ня было. На ўсходзе зьявіліся татары, а на захадзе — Польшча.

kamunikat.org

Татары, пасьля шарэгу больш, ці менш, крывавых баёў, падбілі рускія княствы на чале зь Кіевам. З маланкавай хуткасьцю яны апынуліся на ўсходніх і паўдзённых узьмежжах Беларусі. Але тут яны сустрэлі рашучы адпор. Спачатку яны былі адбітыя ад Смаленску, а потым у неаднаразовых баёх пабітыя на паўдні. Татары пакінулі Беларусь у спакою, а рынуліся ў Заходнюю Эўропу дзе іх з трудам паўстрымалі.

Гэты мамэнт заслугоўвае на асаблівую ўвагу й падчыркненьне. Сьветчыць ён з аднаго боку аб сіле тагачаснае Беларусі, а з другога, дзякуючы дадзенаму татарам адпору, беларусы абаранілі сабе магчымасьць свабоднага ад татарскіх уплываў культурнага й палітычнага разьвіцьця.

Апошняе адбывалася ў нас з гэтае прычыны накш, як у іншых усходня-славянскіх народаў, каторыя, дзякуючы доўгаму татарскаму ярму, набылі ў вялікшай, ці меншай ступені татарскі культурна — палітычны сьветагляд, татарскія навыкі.

Аж да вызваленьня Масквы ад татарскае няволі (канец XV ст.) Беларусь мела прад сабой на ўсходзе з палітычнага гледзішча адзіны татарскі сьвет. Ходаньне ў вялікіх разьмерах зь ім ня спынялася аж да сьмерці гаспадара Аляксандры Ягайлавіча (1505). Фактычна, аднак, Беларусь мела тут і другога праціўніка, якім было вырастаўшае над татарскай апекай Вялікае Княства Маскоўскае. Пасьля таго, як гэтае гаспадарства ськінула зь сябе палітычную залежнасьць ад татараў, яно выявіла сябе, як зацятага ворага Беларусі, пераняўшы на сябе шмат у чым татарскія традыцыі ў змаганьні зь Беларусьсю. Дасюлешнія валадыры ўсходу — татары — з вызваленьнем Масквы, падзеленыя палітычна, сталіся дзейнікам, выкарыстоўваным Беларусьсю й Масквой у іх змаганьні. У той час, калі Масква падбухторвала супроць нас крымскіх татараў, Беларусь зь няменшай скуткоўнасьцю падбухторвала супроць Масквы Залатую Арду (над Волгай).

У вяковых змаганьнях з усходам, — ці то з татарамі, ці з Масквой, трэба разрозьніваць дзьве пары. Аж да сьмерці Вітаўта, калі Масква была яшчэ ў моцнай залежнасьці ад татараў, Беларусь вяла на ўсходзе **экспансыўную** палітыку, мэтай якой было ня



kamunikat.org

толькі задзіночаньне ўсіх беларускіх земляў у адным беларускім гаспадарьстве й рывалізацыя з татарамі за ўплыў на ўсходніх славянаў. Ад сьмерці Вітаўта, калі Масква пачала дужэць і падняла прэтэнзіі нават да крывіцкіх земляў, становішча Беларусі на ўсходзе сталася **абаронным.**

Пасма бязупынных войнаў Беларусі з Масквой дае найлепшую характарыстыку адносінаў з гэтым суседам. Прыязныя адносіны зь ім ніколі не ўстанаўляліся. Культурна — гэта былі два процілежныя сабе сьветы. З апошняга гледзішча зьвяртае на сябе ўвагу факт, што яшчэ за Жыгімонта Аўгуста ў II Статуце была зьмешчана пастанова, якая дазваляла крывіцкай моладзі выяжджаць на студыі ўва ўсе краі Эўропы, за выняткам бусурманскіх і Масквы, якая была да іх прыраўняна.

Так вялікае заданьне на ўсходзе, як барацьба з татарамі і Масквой патрабавала ад Беларусі напружаньня ўсіх яе сілаў. У мамэнтах, калі палажэньне было асабліва крытычным, на захадзе выступаў з сваімі прэтэнзіямі другі непрыяцель — Польшча. Цікава, што Польшча не выступала супроць Вялікага Княства Літоўскага з аружжам у руках. У яе ня было дзеля гатага патрэбных сілаў, а да таго, яна была занята барацьбой з сваімі паўдзённымі суседзямі. Але яна імкнулася здабыць беларускае гаспадарства «дыплёматычным» способам. Прыракаючы (а між іншым ніколі не датрымоўваючы!) помач Вялікаму Княству ў барацьбе з усходам, яна дамагалася цясьнейшае палітычнае сувязі зь ім. Згэтуль паўсталі так званыя вуніі з Польшчай, пачынаючы ад Крэўскай (за Ягайлы), аж да Люблінскай.

Гэтыя вуніі трэба разглядаць не як дабравольны праяў волі Беларусі да цясьнейшага сужыцьця з Польшчай, а выключна як нявыгодныя міжнародныя дагаворы, каторыя былі вымушаны Польшчай ня войнамі, а выкарыстаньнем прымусовага палажэньня Беларусі праз абяцаньне дапамогі ў змаганьні на ўсходзе. Гэтым тлумачыцца, што калі мінала небясьпека на ўсходзе, вуніі анулявaліся, прынамся практычна. Нават Люблінскае вуніі няможна разглядаць, як касаваўшае незалежнасьць беларускае гаспадарсьцьвенасьці, бо доўгі час яна мела толькі тэорэтычнае значэньне, а беларускае гаспадарства згубіла сваю палітычную

незалежнасьць не дзякуючы пастановам у Любліне, а культурнай і прыйшоўшай за ёю палітычнай асыміляцыі кіруючае прослані народу на карысьць польшчыны, што мела месца значна пазьней. Да Люблінскае вуніі мы ня можам прывязваць вялікшага, значэньня за тое, якое ёй падаў Леў Сапега. Як ведама, ён не зьмясьціў Люблінскага пакту ў кодэксе правоў, што абавязваў у Беларусі — III Статуце, чаго не зрабіў-бы, калі-б яна мела глыбейшыя палітычныя насьледкі.

Зьвяртае на сябе ўвагу факт, што ў другім пэрыёдзе адносіны Беларусі будаваліся на тым фундамэньце, што, каб мець магчымасьць зграмаджаньня ўсіх сілаў на ўсходзе, быў неабходны супакой на заходняй мяжы. Асягненьне гатага супакою ня йшло далей за спробы паразумленьня з Польшчай. Аж да паловы XVII ст. мы ня бачым ніводнае спробы асягненьня гэтага супакою іншым шляхам, напр. Навязаньня цясьнейшае лучнасьці з крыжакамі, або іншымі эўрапэйскімі гаспадарствамі, каторыя маглі-б быць памочнымі ў падтрыманьні пазыцыі Беларусі адносна Польшчы. Адсутнасьць гэтай глыбейшай народнае палітыкі ў Беларусі адбілася блага на фармаваньні тагачасных беларуска-польскіх адносінаў.

Толькі ў палове XVII ст. мы бачым спробу рэвізіі адносінаў Беларусі да сваіх суседзяў, спробу шуканьня новых асноў для беларускае вонкавае палітыкі. У гэтым часе польскі націск на Беларусь быў ужо так моцным, палажэньне абыдвух краёў было так няроўным, што ня было сэнсу нават думаць дайсьці зь ёй да якогась паразумленьня, каторае-б не наражала гонар беларускае гаспадарсьцьвеннасьці. Тады Ян III Радзівіл, выкарыстоўваючы польска-швэдзкую вайну і цяжкое палажэньне, у якое лучыла Польшча, імкнецца правесьці думку паразумленьня з Скандынавіей, рэпрэзэнтаванай Швэцыей і на ёй думае аперціся ў змаганьнях з усходнім і заходнім непрыяцелем. Але гэтая канцэпцыя прыйшла лішне позна і ў дадатку яна не знайшла належнага зразумленьня ў тады ўжо моцна спольшчаным беларускім магнацтве. З сьмерцю Яна Радзівіла памерла і ягоная канцэпцыя.

Яшчэ раз зьвяртаем увагу на неабходнасьць падчырткваньня як выходнага пункту пры абгаварваньні адносінаў Беларусі з суседзямі йснаваньня ў тагачаснай беларускай вонкавай палітыцы пасьлядоўнасьці ў фармаваньні адносінаў з суседзямі, якая выплывала з сьведамасьці патрэбы захаваньня самастойнасьці беларускага гаспадарства — Вялікага Княства Літоўскага. Гэтая пасьлядоўнасьць ня была мо' належна разбудавана, ня былі выкарыстаны ўсе магчымасьці, але і яна бясспрэчна йснавала. Запярэчаньне гэтай думкі некаторымі прадстаўнікамі афіцыйяльнае польскае, або расейскае гісторыі, ня мае ніякіх асноў і іхніх, цалкам фальшывых з гэтага гледзішча цьверджаньняў мы ня можам паўтараць пры выкладаньні беларускае гісторыі.

**КУЛЬТУРА**

Пры аглядзе культуры Беларусі ў мінуўшчыне, трэба зьвярнуць увагу на вельмі важную яе азнаку — самабытнасьць. Маем на ўвеце самабытнасьць культуры духовай, не матэрыяльнай. Самабытнасьць культуры народу мае такое-ж важнае значэньне ў ягоным жыцьці, як, прыкладам, мова. Народ, які страціў сваю культуру й лучыў пад неабмяжаваны ўплыў чужой, заўсёды пераставаў быць сабой, ня жыў сваім собскім, нацыянальным, жыцьцём, бо за культурнай асыміляцыяй прыходзіла палітычная ды кажная іншая. Ведамым ёсьць сказ Ф. Багушэвіча: «не пакідайце мовы сваей беларускай, каб не памерлі». Тое самае можна сказаць аб значэньні культуры для народу.

У чым выражаецца самабытнасьць культуры й чаму народ павінен імкнуцца яе захаваць? Трудна тут шырэй на гэтую тэму гаварыць, але трэба зьвярнуць увагу на наступнае. Кажны народ — гэта ня толькі азначаная колькасьць людзёў супольнага паходжаньня, што жыве шчыльнай масай на дадзенай тэрыторыі й гавора аднэй мовай, але й аб'яднаная адным духовым сьветаглядам, аднымі звычаямі, аднэй псыхікай. Гэтыя духовыя свомасьці народнае душы выробляюцца вякамі, а мо' й тысячагодзьдзямі, а на фармаваньне іх маюць уплыў ня толькі прыродныя абставіны, у якіх даны народ жыве, але й супольна перажытая барацьба за йснаваньне ў мінуласьці, што пакінула па сабе пэўную суму народных традыцыяў, якія твораць скарб народнага дазнаньня й мудрасьці. Захаваньне, гэтага духовага скарбу для народу ёсьць



kamunikat.org

жыцьцева неабходным і зьяўляецца складовай часткай яго паняцьця. Ён ёсьць найлепшым настаўнікам у жыцьці народу, ён вызначае спраўджаныя стагодзьдзямі вехі народнага паступаваньня. Хоць нельга цьвердзіць, што мінуўшчына ёсьць заўсёды і ўсюды настаўніцай жыцьця, але ў галоўных асновах яна, бязумоўна, ёй ёсьць і да ейнага голасу трэба прыслухоўвацца. Для каго ня будзе, прыкладам, дастаткова павучальнай хоць-бы гісторыя навейшых баларуска-польскіх, або беларуска-маскоўскіх культурных і іншых адносінаў калі-б ён заінтарасаваўся гэтай квэстыей, усе роўна зь якой нагоды?

Вось-жа духовы культурны скарб ёсьць першараднае вагі крыніцай сілы народу, магутнай зброей у хаваньні за ягонае йснаваньне. І калі гэты скарб траціць свае народныя свомасьці, падменьваецца іншым, чужым, дык, зразумела, народ пачынае жыць чужым дазнаньнем і мудрасьцю, што азначае для яго няўхільную сьмерць, бо як правільна кажа народная прыказка, чужым розумам далёка ня зойдзеш. Можна й часам трэба, нават, выслухаць, што ён гавора й зь ім згадзіцца, калі ён ёсьць дастаткова пераканалыным, але ў прынцыпе — трэба перш усё прапусьціць праз прызму свайго собскага народнага розуму.

Самабытнасьць духовае культуры народу й палягае ня толькі на разьвіцьцю радзімых псыхолёгічных асноў духовае язьні народу, але й на перайманьню чужых культурных зьявішчаў, аднак пад умовай папярэдняга скантраляваньня іхняе карыснасьці праз менаваную прызму народнае мудрасьці. Самабытная культура ў гэтым разуменьні — гэта ня культура ранейшых кітайцаў, што адгараджваліся ад іншага сьвету высокай сьцяной. Разьвіваючы радзімыя асновы духовае культуры народу, самабытнасьць не бароніцца ад сутыку з чужымі культурнымі ўплывамі, а толькі адкідае бяскрытычнае перайманьне апошніх, загадвае паддаваць іх кантролі.

Сяньня ў пару так дасканальных мэтадаў культурнае барацьбы можна ўявіць сабе йснаваньне адумыснае інстытуцыі, каторая-б магла спэцыяльна займацца гатый справай і гэткія ўстановы маюць шмат якія культурныя народы. Але ў мінуўшчыне ролю гэтака абаронцы сваей культуры выкопваў адзіна толькі **самабытны**

**культурны інстынкт** народу, асабліва ў нас. Ён падсьведама кантраляваў чужыя ўплывы й пераймаў толькі тое, што ўважаў за карыснае, або, прынамся, няшкоднае.

Само сабой зразумела, што гэты інстынкт павінен быць дастаткова сільным, каб магчы выканаць гэтую ачышчаючую функцыю. Асновы собскае культурнае язьні народу, скуль бярэ пачатак гэты інстынкт, павінны быць няслабшымі за асновы чужое культурнае язьні, бо накш гэтая сялекцыя ўплываў немагчымая. Слабшыя асновы будуць заўсёды пераможаны сільнейшымі.

І калі мы сяньня чуем, што беларускі народ, побач з сваёй мовай, у вяковых змаганьнях з так вялікімі культурнымі потэнцыямі захаваў і асновы свайго самабытнага культурнага сьветапогляду, што ёсьць незапярачальным фактам для кажнага, дык можна ўявіць, як сільным быў у яго гэты самабытны культурны інстынкт, як сільнымі ёсьць духовыя асновы беларускае культурнае язьні. Панесеныя й зразумелыя страты ў гэтым шматвяковым культурным ходаньні з гэтага гледзішча ня маюць значэньня. Яны — драбніца ў прыраўнаньні з тым, што захавалася. Захавалася культурная душа народу. Ён абараніўся ад культурнае асыміляцыі, якая была тым больш небясьпечнай, што йшла ў прыраўнальна лёгкай да страўленьня форме, бо суседняй, славянскай.

Мы ня маем яшчэ працаў, каторыя-б поўнасьцю ахаплялі духовыя асновы самабытнае культурнае язьні беларускага народу, далі абраз іх разьвіцьця й ходаньня за йснаваньне, на якіх можна было-б аперціся пры высьвятленьні гэтай так важнай квэстыі. Ёсьць толькі няпоўныя фрагмэнты, спробы частковага падыходу да гэтага заданьня, як, прыкладам, ведамая праца М.Шчакаціхіна аб беларускім мастацтве, пакуль што канкратна аб архітэктуры. Але й з таго, што ўжо ёсьць можна збудаваць працэс разьвіцьця беларускае культуры, ды ўхапіць тыя самабытныя асновы беларускае культурнае псыхікі, на якіх ён апіраўся й апіраецца сяньня.

Геаграфічнае палажэньне беларускага народу было й ёсьць такім, што ўжо ад пачатку свайго гістарычнага жыцьця ён быў выстаўлены на ўплывы вялікіх культураў з усіх бакоў — захаду,

усходу, поўначы, паўдня. Яны ўзмагліся асабліва ад часу прыняцьця хрысьціянства, што ўзняло Беларусь у цесны сутык з культурнымі камплексамі, якія мы сяньня называем Заходам і Ўсходам. Аднак паміж ўсяг Беларусь не зрабілася краем мэханічнага палучэньня гэтых культураў, а разьвіла сваю аднастайную, беларускую, на ўсім прасторы, займаным беларускім народам з значнай тэндэнцыей да ўплыву на культуры суседнія. Перайманыя чужыя ўплывы, усе роўна скуль яны прыходзілі, «пера-рабляліся» тут у беларускай культурнай кузьні на беларускі спосаб і толькі тады даставалі права грамадзянства ўва ўсім краі. Гэтае зьявішча абсалютна сьцьверджанае, на што трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу. Яно выступала ў кажнай галіне культурнага жыцьця беларускага народу, ці мы возьмем рознабаковую творчасьць народных масаў, ці адукаваных кругоў, уклад іх жыцьця, іхнія вераваньні, сьветагляд, звычаі, будаўніцтва й г. д. Усюды можна знайсьці, побач з чыста беларускімі асновамі, сьляды чужых уплываў, але яны так пераварaны, што ў прысабечанай народам форме іх нельга накш назваць, як беларускімі. Гэтая асыміляцыя чужых уплываў ішла так далёка, што такі кладам, гатыцкі стыль, у Беларусі, як кажа Шчакаціхін, ня быў прыняты у чыстай форме, а змадыфікаваны на беларускі спосаб, згарманізаваны зь беларускім стылем... Ня ён перамог беларускі стыль царкоўнага ці касьцёльнага будаўніцтва, а толькі быў выкарыстаны як прыгожая разнаякасьць у рамах агульна-беларускага стылю. Паасобных прыкладаў з розных галінаў можна было-б прывесьці вельмі многа, але ў рамах гэтага артыкулу ня месца гэтым займацца. Мы хочам толькі зьвярнуць увагу на неабходнасьць разгляданьня беларускай культуры пры яе вывучэньні як культуры самабытнай у вышэй азначаным сэнсе. Гэта ёсьць прынцыповы падход да беларускае культуры і толькі з гэтага гледзішча можна разглядаць камплексы, ці паасобныя культурныя праявы ў беларускай мінуўшчыне. Падчыркнуўшы самабытнасьць беларускае культуры ў тым значэньні, як падалі вышэй, неабходна зьвярнуць увагу на другую яе вельмі йстотную азнаку, пайменна — **заходня-эўрапэйскі** характар гэтае культуры. Гэтая апошняя азнака зусім не касуе самабытнасьці нашае

культуры, бо як ужо было падчыркнена, яна не насьлядавала сьлепа заходня-эўрапэйскіх узораў, а, паколькі іх пераймала, дапасоўвала да мясцовых умоваў, да духовых і матарыяльных патрэбаў беларускага народу. Таму яна творыць **самабытную разнаякасьць** заходня-эўрапэйскае культуры, як гэткую-ж разнаякасьць твораць культуры нямецкая, француская, італьянская, ангельская, скандынаўская, вугорская, чэская і г.д.

Калі з культурнага гледзішча Захад проціставіцца Усходу, дык гэтага нельга разумець у тым сэньсе, што заходня — эўрапэйская культура творыць ува ўсіх сваіх праявах і ўсюды нешта адналітае, што паўтараецца аж да дробязяў ува ўсіх заходня-эўрапэйскіх народаў, як нельга выказаць падобнае думкі аб культуры Усходу. Як на Захадзе, так і на Усходзе маем апрычоныя нацыянальныя культуры, каторыя адпаведна ўкладаюцца ў заходнія, або ўсходнія культурныя рамкі.

Розныя заходня-эўрапэйскія культуры маюць адны супольныя асновы, каторыя адрозьніваюць іх ад камплеску ўсходніх культур, што маюць, такжа, свае супольныя, але процілежныя эўрапэйскім фундамэнты. Заходня-эўрапэйская культура азначаецца **заўсёдным гонам да прагрэсу, дасканаленьня, да шуканьня новых шляхоў разьвіцьця,** а ўсё гэта адбываецца ў **імя культу людзкое адзінкі, грамадзкасьці, наагул чалавека.** Усходняя культура — гэта **абсалютнае панаваньне абстранцыйных ідэяў і забабонаў, у абліччы якіх чалавек ёсьць нічым, нулём.** Згэтуль усходнія культуры азначаюцца **стагнацыяй, запярэчаньнем поступу, патрэбы дасканаленьня, наагул зьмены йснуючых адносінаў, бязьмежнай дэспотыей.**

Культуры заходніх народаў вырасьлі з супольнага грэка-рымскага пня. Старажытныя грэкі перадалі па сабе ў спадчыне ідэалізм, непаўстрыманы гон да поступу, да шуканьня новых шляхоў разьвіцьця чалавецтва, галоўна ў сфэры духу, тады як практычныя рымляне перадалі ймкненьне да дасканаленьня матарыяльнае культуры. Гэткім чынам пачаткаў сучаснае эўрапэйскае культуры трэба шукаць ужо ў глыбокай старажытнасьці. Эўрапэйскія народы, што спаткаліся з клясычнай культурай у пачатках сваей гісторыі, чэрпалі зь яе поўнай жменяй

KAMUNIKAT.org

культурную страву. Асыміляцыя іх антычнай культурай пайшла так далёка, што яны пераймалі клясычныя мовы як мовы сваей пісьменнасьці, адукаваных клясаў. Але культуры эўрапэйскіх народаў паўсталі не адзіна толькі з рэцэпцыі гэтых грэка-рымскіх культурных элемантаў, а толькі з сынтэзы іх з радзімымі культурнымі асновамі. А дзеля таго што апошнія былі неаднолькавыя ў розных народаў, дык згэтуль выплываюць і нацыянальныя размавітасьці эўрапэйскае культуры.

Пытаньне, ці розныя культуры Усходу мелі якуюсь супольную крыніцу, каторая пераказала ім вышменаваныя азнакі, мы абмінаем, бо разважаньні на гэтую тэму завялі-б нас лішне далёка. Зьвяртаем толькі ўвагу на факт існаваньня ўва ўсіх размавітасьцяў усходняе культуры пералічаных супольных азнакаў. Ці мы возьмем культуру кітайскую, японскую (да яе эўрапэізацыі), індускую, нават маскоўскую, хоць апошняя і да Пётры Вялікага пад уплывам суседняе эўрапэйскае Беларусі выказвала лёгкую тэндэнцыю да поступумы ў кажным выпадку заўважым задзіўляючую стагнацыю, запярачаньне ўсякае патрэбы поступу, неабмяжаванае панаваньне адвалочных ідэяў і забабонаў, усё роўна якое натуры, каторыя сваім фаталізмам таптали чалавечую годнасьць, рабілі з чалавека нішто. А калі чалавек яе прадстаўляў сабой ніякага інтарэсу, дык, запраўды, зусім кансэквэнтна, быў лішнім усялякі гон да поступу ў ягоных інтарэсах. Што-ж датычыць ягоных фаталістычных абстракцыйных ідэяў, дык яны былі «боскага паходжаньня» і так дасканальныя, што ня толькі не патрабавалі, але згары выключалі ўсялякую патрэбу сваей рэвізіі.

Усе народы Усходу, каторыя знаходзіліся пад дзеяньнем усходніх культурных уплываў, быццам застылі ў сваім разьвіцьці. Сотні і тысячы год не прыносілі ніякіх зьменаў у іхнім сьветаглядзе, у іхнях матарыяльных умовах разьвіцьця. Кітайцы на пераломе дваццатага стагодзьдзя выступілі супроць эўрапэйскае інвазіі з малюнкамі сваіх страшных зьмяёў, веручы, як ма' быць тысячы год назад іхнія продкі, што яны «спалохаюць» ворагаў і тыя адступяць. Толькі прышчэн усходнім народам заходняе культуры скранаў зь месца гэтую застыглую стагнацыю, чаго дасканалым прыкладам можа быць Японія. Цяпер усім ясна, што

японскі народ ёсьць нязвычайна здольны, што ён робіць вялікія поступы ўва ўсіх дзялянках духовае й матарыяльнае культуры. Але такім ён стаўся вельмі нядаўна — ад паловы мінулага стагодзьдзя, калі яму была прышчэплена эўрапэйская культура. Да гэтага часу, у працягу тысячагодзьдзяў, японцы дзялілі незайздросны лёс усіх іншых народаў усходняе культуры. Без прыняцьця асноў эўрапэйскае культуры, яны напэўна  і да сяньняшняга дня былі-б застыглым у сваёй велічы ўсходнім народам. Наагул, усе ўсходнія народы эвалюцыянуць патолькі, паколькі яны прынялі заходнюю культуру. Дзе гэтая культура не дайшла там сяньня жыцьцё знаходзіцца на тым самым узроўні, на якім было сотні, або тысячы гадоў.

Калі мы зьвернем увагу на культуру нашага ўсходняга суседа — Масквы, дык выпадае й тут сьцьвердзіць усе азнакі ўсходняе культуры аж да Пётры Вялікага, каторы рашуча павярнуў культурнае жыцьцё Масквы на заходня-эўрапэйскія рэйкі. Праўда, гэта датычыла толькі вышэйшых прасланяў маскоўскага народу, маса расейская засталася да апошняга часу за абрубам гэтае культуры. Але сяньня з усёй упэўненасьцю можна цьвердзіць, што ўсё, чым расейцы могуць хваліцца, яны здабылі толькі пад уплывам прынятых асноў эўрапэйскае культуры, што гэтак званая самабытная маскоўская культура з гледзішча яе здольнасьці да эвалюцыянаваньня — міт, байка. Калі ў XVI і XVII стагодзьдзях маскоўская культура выказвала нейкі нахіл да развою, дык адзіна толькі дзякуючы суседзтву зь Беларусьсю, скуль прыходзілі заходняэўрапейскія ўплывы, аб чым мы ўжо ўспомнілі вышэй.

З вышменаванага мы бачым, як вялізарная якасная розьніца йсную між псыхолёгічнымі асновамі заходняга і ўсходняга культурнага сьветагляду. Мы спэцыяльна даўжэй спыніліся над гэтым пытаньнем таму, каб выясьніць даволі заблытанае ў нас уяўленьне прынцыповае розьніцы між заходняй і ўсходняй культурамі, ды каб падчыркнуць тое бязьмернае вагі значэньне квэстыі, ці Беларусь у будучыні будзе гадаваць у сябе эўрапэйскія культурныя асновы, ці асновы ўсходнія.Здаецца, што для ўсіх павінна быць ясным, што ня можа быць дыскусіі над тым, што мы павінны разьвіваць у сабе выключна псыхолёгічныя асновы

kamunikat.org

заходня-эўрапэйскага культурнага сьветагляду й як наймацней адгарадзіцца ад усходніх уплываў. Зьвяртаньне асаблівае ўвагі ў нас на гэтую справу мае тым вялікшае значэньне, што Беларусь, ляжыць на ўзьмежжы між Захадам і Ўсходам, што ўжо, дзякуючы адзіна гэтаму, пытаньне ўсходніх уплываў у нас будзе заўсёды актуальным. Яно тым больш войстрае, што у нас ёсьць многа людзёў, каторыя з культурнага гледзішча, не разумеючы йстоты справы, называюць сябе «ўсходнікамі» й як такія, быццам "процістаўяцца" эўрапэйскаму й адзіна для нас магчымаму культурнаму сьветагляду. Вось-жа пры ўзгадаваньні нашае маладое генэрацыі, а нават старэйшага грамадзянства (аб гэтым мы, на жаль, яшчэ й сяньня павінны гаварыць) вывучэньне вехаў нашага культурнага разьвіцьця й ягоных псыхолёгічных асноў у мінуўшчыне, будзе ня толькі дасканальным памочнікам у гэтай працы, але й паказьнікам паступаваньня ў будучыні. Беларуская культура, пры захаваньні яе самабытнасьці, мела наскрось эўрапэйскі характар. Абедзьве гэтыя азнакі пры аглядзе культурных падзеяў беларускае мінуўшчыны не павінны быць выпушчаны з вока, а наадварот, пры кажнай нагодзе паўтараны. Гэта ня толькі паможа правільна зразумець істоту нашага мінулага культурнага жыцьця, але й будзе ўзгадоўваць у нашай псыхіцы здаровыя, традыцыйныя асновы культурнага сьветагляду.

Эўрапэйскі характар беларускае культуры сьцьвярджаюць дасьлядаваньні беларускага культурнага тыпу ў мінуўшчыне й культурных беларускіх памяткаў, што захаваліся да нашых дзён.

Беларускі культурны тып можна найлепш пазнаць, студыюючы выдатныя беларускія гістарычныя асабістасьці. Нельга пры гэтай нагодзе не сказаць, што ў нас зьвярталася страшэнна мала ўвагі на пазнаньне, хоць-бы ў звычайных біёграфічных рамках, жыцьця й дзейнасьці вялікіх прадстаўнікоў нашага народу, што магло-б мець вялікае ўзгадавальнае значэньне. Мы ведалі значна больш аб вялікіх людзёх з гісторыі нашых суседзеў і вельмі мала, а то й блізу зусім нічога, аб сваіх. Гэтую нястачу трэба як мага хутчэй папоўніць. Але дзеля адлюстраваньня беларускага культурнага, тыпу трэба вывучаць ня толькі нашыя вялікія асабістасьці, а й звычайных людзёў, паколькі дадзеныя аб іх захаваліся. Фігон

Кміта, прыкладам, ня быў вялікай асабістасьцяй але колькі-ж цікавага, матарыялу з гледзішча, якое нас інтарасуе, могуць даць студыі  ягонае спадчыны.

Асновы эўрапэйскае культуры спрыялі разьвіцьцю індывідуальнасьці чалавека, выробленьню ў ім рознабаковага заінтарасаваньня, шматграновасьці псыхолёгічнага тыпу. Увага чалавека зьвярталася на розныя дзялянкі жыцьця, ён мог праявіць свае здольнасьці, ініцыятыву, пры гэтым ён ня чуў сябе нявольнікам якіхсь надпрыродных вышэйшых ідэяў, каторыя-б вязалі ягоную духовую йстоту. Само сабой зразумела, што і ў Эўропе былі поры, або спарадычныя прыпадкі, калі розныя ідэі вышэйшае натуры, прыкладам, рэлігійныя, трымалі чалавека ў пэўных рамках думаньня, часамі сьцягвалі на яго розныя прыкрасьці, але гэткі стан ня быў агульным правілам, а толькі выняткам. Прынцыпова, асновы , эўрапэйскае культуры спрыялі развіцьцю чалавечае індывідуальнасьці, ня путалі яе ймкненьняў да поступу, каторы, як прадумову, прызнаваў чалавеку права крытыкі йснуючага стану рэчаў. На гэтай аснове ў Эўропе мы спатыкаем вялікае багацьце псыхолёгічных і культурных тыпаў.

Гэткае багацьце культурных тыпаў мы бачым і ў беларускай мінуўшчыне, ужо ад пачатку гістарычнага йснаваньня беларускага народу. Зьвернем увагу на такіх культурных прадстаўнікоў Беларусі, як полацкая князёўна Рагнэда, за якой Беларусь прыняла хрысьціянскую веру й Прадслава (Афрасіньня), князь Усяслаў Чарадзей, Клімэнт Смаляціч, Кірыла Тураўскі смаленскіх князёў Мсьціслава, Рамана, Расьціслава, і г.д., і г.д. Усе яны — гэта рэдкія й багатыя псыхолёгічныя й культурныя тыпы ня толькі ў беларускай гісторыі, але агулам у гісторыі Эўропы А як размавітым быў круг іхняга заінтарасаваньня, багацьце іхняе духовае язьні, — аж да процілежнасьцяў! Так было ў першую пару гісторыі Беларусі, тое самае наглядалася ў другую. Гісторыя навейшага адраджэнскага беларускага руху павучае нас, што і ў навейшых часох у нас наглядаецца тая-ж псыхолёгічна-культурная размавітасьць тыпаў.

Усе гэтыя адмены культурных тыпаў маюць супольныя, часта беларускія асновы духовае язьні, што наглядаюцца, паміма ўсяе

kamunikat.org

разнаякасьці гэтых тыпаў, абсалютна ўва ўсіх. Суровая доля, якая спаткала беларускі народ, вечнае змаганьне за йснаваньне, безьмяр дазнаванае ў гісторыі крыўды — разьвілі ў беларускім народзе толькі яму свомыя азнакі душы, каторыя й выступаюць з асаблівай яскравасьцю ў культурных прадстаўнікоў нашае мінуўшчыны, на якіх будаваўся іхні культурны сьветагляд. Суровыя ўмовы жыцьця вырабілі ў беларускім культурным тыпе перадусім практычнасьць. Розум беларускі быў ськіваваны наўперад на рэчы практычнае натуры, каторыя ў той ці іншы спосаб былі зьвязаныя зь ягонаю рэчаіснасьцю, упарадкоўвалі, або дасканалілі яе. У нашых культурных прадстаўнікоў мы зусім ня бачым глыбейшых праяваў мэтафізічных разважаньняў, контэмпляцыі. Усё, што зьвяртала іхнюю ўвагу, было так, ці накш, зьвязана з жыцьцём, у ім знаходзіла свае карэньні. З гэтага гледзішча беларускі культурны тып быў больш падобны да рымскага, як да грэцкага. Але гэтае практычнасьці ня трэба разглядаць як праяву эгаістычнае, матарыялістычнае асновы беларускае душы, што мела месца ў рымлянаў. Эгаізму й матарыялізму беларускі народ у сабе мае вельмі мала. Практычнасьць ягонага розуму была дыктавана, яму вонкавымі ўмовамі жыцьця, а не эгаістычна — матарыялістычнымі асновамі культурнага сьветагляду.

Дазнаныя ў працягу стагодзьдзяў крыўды, вырабілі ў беларускім народзе тугу за справядлівасьцю, склоннасьць да шуканьня гэтае праўды, справядлівасьці. Гэтая адзнака беларускага культурнага тыпу выступае нязвычайна пуката ўва ўсіх ягоных адменах. Апошняе слова ёй даў наш вялікі родзіч, прафэсар права б. Пецярбурскага унівэрсытэту Лявон Петражыцкі, сэнс глыбокіх досьледаў каторага можна азначыць адным сказам — права ёсьць сілай, а ня сіла правам, як гэта шмат дзе было прынята думаць на захадзе. Гэтая думка пануе ў беларускім культурным сьветаглядзе праз усе вякі йснаваньня народу. Хто хоча зь ёй лепш пазнаёміцца, хай прастудыюе хоць-бы ліст Льва Сапегі да Язахвата Кунцэвіча, у якім Сапега (у пачатках XVII стагодзьдзя!), калі ўсюды ў Эўропе панавала цёмная пара, выказаў такія думкі аб паняцьці праўды й справядлівасьці, да якіх чалавецтва дайшло толькі ў XIX стагодзьдзі, перажыўшы пару

kamunikat.org

француськага рацыяналізму, нямецкага рамантызму, глыбокіх рэвалюцыйных рухаў. А трэба ведаць, што Сапега быў зусім не адзінокі з сваімі думкамі ў Беларусі. Шуканьне вечнае праўды, справядлісьці ў адносінах людзёў і народаў вырабіла ў беларускім народзе мякчыню душы, характару. Беларус з маланкавай хуткасьцю разумее чужую крыўду і ў сваім жаданьні памагчы, гатоў, нават, ахвяраваць свае інтарэсы. Нельга сказаць, каб гэтая рыска народнага характару ў абставінах жыцьця, што вызначыла нам гісторыя, была дадатнай. Аднак яна была й засталася неадлучнай ад беларускай псыхікі й гэта мы мусім сьцьвердзіць. Вось псыхолёгічныя свомасьці беларускага характару, вось азнакі агульнага беларускага культурнага тыпу, на якіх выраслі багатыя яго адмены. Мы ўвесь час умысна лучым псыхолёгічныя асновы беларускае душы з асновамі беларускага культурнага сьветагляду, што павінна быць зразумелым, бо якая душа народу, такая й ягоная культура. Немагчымай ёсьць будова культурнага сьветагляду народу на іншых, або процілежных ягонай душы асновах. Калі апошняе мае месца, тады мы маем дачыненьня з культурнай асыміляцыей, а не з радзімай культурай. Гэтым багацьцем адменаў культурнага тыпу эўрапэйскія народы розьняцца ад народаў усходняе культуры. Там нідзе не паўстала размавітасьць культурнага тыпу. Як вялікім і шырокім ёсьць Усход, так аднастайным ёсьць там псыхолёгічны й культурны тып. І гэта зразумела. Асновы ўсходняе культуры, у якіх усё было падпарадкавана фаталізму абстракцыйных ідэяў, выключалі свабоду чалавечае індывідуальнасьці, падганялі ўсё над адзін фасон думаньня. Калі й былі такія, што ва- жыліся выйсьці за агульна прынятыя рамкі думаньня, дык іх «ліквідавалі» ад пачатку. Таму гісторыя ўсходніх народаў не пераказала нам ніякіх праяваў свабоднага думаньня чалавека, нат ніякіх спробаў зрабіць гэта. Прыклад нашага ўсходняга суседа будзе з гэтага гледзішча для нас асабліва павучальным. Да прыняцьця эўрапэйскае культуры (за Пётры Вялікага) там ня было ніякага ўмыслова — культурнага руху, апрача жудаснае з нашага пункту гледжаньня плыні пратапопа Авакума. Прыняцьце эўрапэйскае культуры ўзбагаціла расейскі культурны тып, але толькі сярод вышэйшага

kamunikat.org

сацыяльнага слою народу — дваранства, маса-ж расейская засталася ўсходней культуры аж да нашага часу. Прынцыпы народнае расейскае культуры выступілі асабліва войстра на ўзьверх у апошнім часе, за бальшавікоў. Страціўшы асновы сваей веры, свайго народнага сьветагляду, якія былі ўцялесьнены ў асобе цара, расейская маса зь ненавісьцю адкінула прапанававыя ей (за тымчасовага ўраду) эўрапэйскія культурныя асновы й прагавіта хапілася за свае радзімыя, каторыя ей падсунулі бальшавікі. У іх яна знайшла тое, без чаго не магла жыць — фаталізм і пэрсоніфікацыю ідэі. Культ Сталіна з гледзішча расейскае масы нельга разглядаць як нейкае штучна разьдзьмуханае зьявішча. Ён выплывае з усходніх асноў маскоўскага культурнага сьветагляду, які для свайго йснаваньня патрабуе «боскага» носьбіта фаталістычнае ідэі.

Дасьлядуючы псыхолёгічна — культурны тып беларуса ў мінуўшчыне, нельга яго поўнасьцю ідэалізаваць. З пэўнасьцю шмат чаго ў ім было благога, або недасканальнага, бо калі-б усё было ў парадку, дык мы не апынуліся-б у такім стане, у якім знаходзімся цяпер. Але нам ідзе ў даным прыпадку аб сьцьверджаньне размавітасьці беларускага культурнага тыпу, ягонага заходня-эўрапэйскага характару. Вось-жа з гэтага гледзішча, памінаючы яго добрыя й благія бакі, ён зьяўляецца, бясспрэчна, заходня-эўрапэйскім.

Пераходзячы да культурных памятак нашае мінуўшчыны так пісьменных, як і рачовых, ня будзе асаблівае труднасьці праканацца, што й яны сьветчуць аб неадарвальнай лучнасьці беларускае культуры з заходня-эўрапэйскаю.

Практычнасьць беларускага культурнага сьветагляду выклікала тое зьявішча, што ў нас разьвіваліся наўперад практычныя дысцыпліны, а між імі наўперад права, літаратура рэлігійная, гісторыя. Прыгожае пісьменства, ды мэтафізычныя дасьлядаваньні мала інтарасавалі культурнага беларуса ў мінуўшчыне. Беларускае права, апёртае перадусім на радзімых праўных звычаях, дайшло да асабліва высокага разьвіцьця й дасканаласьці ў г. зв. Статутах Літоўскіх. Значэньне беларускага права выйшла далёка за межы Беларусі, бо яно аказала вялізарны ўплыў на разьвіцьцё права

ў Маскве й Польшчы. Так у Маскве на беларускім Статуце будавалася ня толькі «Уложэніе царя Аляксея Міхайлавіча» але й навейшая расейская кодыфікацыя — X. том Збору Законаў. У Польшчы хоць ня было спэцыяльна выдадзенага праўнага кодэксу, але нормы беларускага права былі там шырака прынятыя. Дасьлядуючы юрыдычныя памяткі нашае культуры, што былі толькі кодыфікацыей беларускага звычаёвага права, лёгка заўважыць, што асновы юрыдычнага беларускага сьветагляду былі эўрапэйскія. Права не разглядалася ў Беларусі як адзін з шматлікіх сродкаў уціску людзёў у рукох «бога» — дэспата, а як сіла, што стаіць над гаспадаром і падданымі. Права ў Беларусі, як прыгожа выказаўся Л. Сапега, было мунштуком, каторы стрымліваў самаволю гаспадара, забясьпячаў вольнасьць адзінкі перад ім. Яму павінны былі падпарадкавацца й гаспадар і падданы. Любячы вольнасьць, як ізноў выразіўся той-жа Сапега, мы тым гардзімся між іншымі народамі, што ня маем над сабой пана, каторы-б узаемаадносіны з падданымі апіраў толькі на сваей самаволі. Вельмі рана ў Беларусі быў прыняты прынцып, які забараняў пазбаўляць чалавека свабоды, калі ён не зрабіў праступку супроць права. На гэтым фундамэньце фармаваліся ў Беларусі грамадзка-палітычныя адносіны. Гэта стварала пэўнасьць, стабілізацыю гэтага жыцьця на прынцыпах, каторыя мы знаходзім у праве толькі найбольш разьвітых эўрапэйскіх народаў. Практычная рыска беларускага культурнага сьветагляду прабіваецца нават у рэлігійнай літаратуры. Скарына рабіў свае пераклады Сьв. Пісьма на беларускую мову не дзеля якіхсь адвалочных мэтаў, а дзеля «пажытку агулу» й з гэтага гледзішча разглядаў свой высокі народны абавязак. Трэба тут падчыркнуць, што пераклад Бібліі на беларускую мову, зроблены Скарынам (вярней гэта было зьбеларушчаньне царкоўна-славянскае біблії) быў трэцьцім ў Эўропе (пасьля нямецкай і чэскай). Перакладаньне Сьв. Пісьма на народную мову ёсьць таксама зьявішчам эўрапэйскім. Заслугоўвае на ўвагу, што так як беларускае права, беларуская рэлігійная літаратура, як і наагул эўрапэйскі склад беларускага рэлігійнага жыцьця меў вялікі ўплыў на рэфармацыю закасьцянелага рэлігійна-царкоўнага жыцьця Маскоўшчыны. Дзеля

kamunikat.org

практычных-жа мяркаваньняў беларусы хацелі мець напісанай собскую гісторыю. Такой гісторыей, доўгі час здаваляўшай патрэбы адукаванага беларускага грамадзянства, быў летапіс, які сяньня нам ведамы пад назовам «Летапіс Быхаўца». Гэта ня ёсьць звычайны летапіс, які паўтарае здарэньні з году ў год, так як яны наступалі. Гэта ёсьць у нас першая спроба напісаньня іменна гісторыі беларускага народу, павязаньня асобных здарэньняў ніткай прагматычнай (прычыновай) сувязі, тлумачэньня фактаў. Праўда, пры тлумачэньні зьявішчаў у ёй тасуецца, галоўным чынам, тэолёгічны мэтад, няма й сьледу сучасных, навуковых, але, усё ж, гэта была спроба дасьлядаваньня сваёй гісторыі. Як на часы, калі гэты «летапіс» быў напісаны, ён быў даскональным і беларусы мелі аснову ім гардзіцца. З гледзішча, якое нас інтарасуе, пайменна сцьверджаньня эўрапэйскага характару беларускае культуры, летапіс Быхаўца ёсьць асабліва цікавым дакумэнтам. У ім мы маем паўторанай г. зв. апавяданьне аб рымскім паходжаньні беларускага народу. Нейкі Палемон, уцякаючы ад перасьлядаваньняў Нэрона, выправіўся шукаць у чужых краёх лепшае долі і ў рэзультаце апьнуўся на нашых землях.... Патомства яго размножылася і ў рэзультаце забылася сваю лацінскую мову, прыняўшы беларускую, бо яна аказалася дасканальнейшай. Гэтае апавяданьне – гэта апотэоза свайго народу й яно сьветчыць, як высока ставілі нашыя продкі самых сябе, калі прыпісалі сабе аж рымскае паходжаньне. Гэтаму апавяданьню паверыла нашая шляхта й гардзілася сваім рымскім паходжаньнем прад польскай. Трэба падчыркнуць, што гэтаму апавяданьню паверыў нават такі польскі гісторык, як Длугаш. Менаванае апавяданьне — гэта, ясна, толькі казка, хоць ёй і верылі. Нас інтарасуе тут другі бок гэтае справы, пайменна, чаму паходжаньне народу было выводжана іменна з Рыму, а ня зь іншага якогась няменш «слаўнага» месца? Дасьлядуючы гэты факт, мы прыходзім да цікавых вывадаў.

Паміма таго, што Беларусь прыняла хрысьціянства з Усходу ў грэцкім абрадзе, Бізантыя, як культурны фактар, нашых продкаў ніколі глыбей не інтарасавала. Зь ёй ня было ніколі глыбейшых сувязяў, зь яе ня йшло да нас блізу ніякіх культурных уплываў, як, прыкладам, у Кіеў ці Маскву. Дзіўным, сапраўды, выдаецца гэтае

kamunikat.org

духовае адсэпараваньне Беларусі ад жарала, зь якога яна прыняла сваю веру! Гэты факт у сьвятле вышменаваных рзважаньньяў ёсьць лёгка вытлумачальным. Справа ў тым, што Бізантыя ў тым часе была гаспадарствам з культурнага гледзішча цалком усходнім. Хоць яна многа чаго пераняла з Грэцыі й Рыму, але ўсходнія ўплывы, што прыйшлі ў Канстантынопаль, спараліжавалі эўрапэйскія асновы бізантыйскае культуры на карысьць усходніх. Таму характар бізантыйскае культуры, як усходняе, быў чужым беларускаму, з натуры сваей эўрапэйскаму, культурнаму тыпу. Вось чаму ён не знаходзіў у Бізантыі нічога годнага насьлядаваньня. Бізантыйскія ўплывы не прыняліся ў нас у чыстай форме нават у галіне рэлігійнацаркоўнага жыцьця. Стыль беларускіх цэркваў ня меў нічога супольънага з бізантыйскім, нутраное ўладжаньне сьвятыняў, хоць рабілася на бізантыйскі узор, было ў нас эўропэізавана. Аб гэтым могуць сьветчыць, прыкладам, нашыя старыя царкоўныя малюнкі сьвятых. Гэта ня высхлыя, змучаныя, аскетычныя постаці бізантыйскіх маляроў, а жывыя людзі. Падкрэсьліваем, што мы гаворым аб старых беларускіх сьвятынях, а не аб тых, якіх сяньня многа ёсьць на Беларусі, тыпова бізантыйскі стыль, якіх прынесла да нас Масква. Вось-жа, калі Масква ўвесь час шукае культурные сувязі й апорышча ў Бізантыі, калі маскоўскі князь Іван III пераймае нават дзяржаўны бізантыйскі герб двухгаловага арла, калі ўладжвае адносіны на сваім двары паводле бізантыйскага ўзору, калі канстантынапальскія духоўнікі, што ўцяклі ад туркаў у Маскву, ствараюць тэорыю, што Масква праз Бізантыю — ёсьць трэцім Рымам —дык гэта павінна быць для нас зразумелым, бо маскоўскі культурны сьветагляд і бізантыйскі мелі тыя-ж супольныя, усходнія асновы. І павінна быць для нас так-жа зразумелым, чаму гэтыя бізантыйскія ўплывы не прыняліся эўрапэйскай Беларусі. Тут створана была тэорыя паходжаньня беларускага народу з Рыму, але Рыму не ў разуменьні маскоўскім, ці бізантыйскім, а эўрапэйскім, як асновапаложніка эўрапэйскае культуры. Рым старажытны, клясычны, быў спадкабернікам культуры клясычнае Грэцыі й разам зь ёй даў асновы эўрапэйскай культуры. Згэтуль выводзіць наш летапісец паходжаньне народу,

kamunikat.org

ці беларускага баярства. І гэта ёсьць найлепшым доказам пачуцьця сваей эўрапэйскае прыналежнасьці нашых продкаў. У сьвятле вышменаваных разважаньняў тэза аб самабытнасьці беларускае культуры ў заходня-эўрапэйскіх рамах ёсьць дастаткова выясьненай. Нашыя разважаньні мы ймкнуліся ў патрэбе ілюстраваць прыкладамі, але не маглі, зразумела, рабіць гэтага ўва усёй шырыні, бо заданьнем гэтага артыкулу ёсьць не вывучэньне культуры Беларусі, ці культурнага тыпу крывіча, а толькі вызначэньне мэтаду, як трэба дасьлядаваць нашую культуру. Падыход да беларускае культуры, як самабытнага зьявішча заходня-эўрапэйскага характару, ёсьць адзіна правільным і толькі гэты маштаб трэба тасаваць пры дасьлядаваньні мінулай культуры Беларусі.

Ведама, аднак, што беларуская культура у вышэй азначаным сэньсе разьвівалася тады, калі йснавала незалежная беларуская гаспадарсьцьвенасьць. Апошняя, як ведама заняпала ў канцы XVII ст. і ад гатага часу на культурнае жыцьцё Беларусі й выпрацаваньне беларускага культурнага тыпу аж да сяньняшняга дня аддзеіваюць розныя іншыя фактары, што ня мелі, або блізу мелі, уплыву на беларускую культуру ў пару незалежнага жыцьця беларускага народу. Вось-жа, паўстае пытаньне — у якой ступені адказвае свайму прататыпу сучасная беларуская культура, сучасны беларускі культурны тып? А калі не адказвае, дык чаму й ці, ў прыпадку йснаваньня розьніцы, варта вам навязваць да культурных традыцыяў нашае мінуўшчыны?

Хоць гэтае пытаньне мае чыста практычны, тэлеолёгічны характар, аднак мы лічым, што яно мае для нас вялізарнае значэньне й таму ў рамах гэтага артыкулу мы хочам яго закрануць. Тут-жа йдзе аб асновы будаваньня нашае новае культуры, нашага сучаснага й будучага культурнага тыпу. А ведама агульна, што культура народу — гэта аснова ўсякага іншага яго разьвіцьця й сьветагляду. У асобнасьці, у вельмі цеснай лучнасьці з культурным сьветаглядам знаходзіцца сьветагляд палітычны.

Калі дваццаць зь лішкай год таму назад беларуская палітычная думка знайшла сваё найвышэйшае афармленьне у абвешчаньні актам 25 сакавіка 1918 г. незалежнасьці Беларусі, дык само сабой

kamunikat.org

зразумела, што рэальнасьць гэтага палітычнага сьветагляду узалежнена ад існаваньня адпаведнага культурнага тыпу крывіча, здольнага ўспрыняць падобны сьветагляд. Мыляюцца тыя, што думаюць, быццам палітычную будову жыцьця народу можна ўзносіць з абы якім культурным тылам, з абы якім культурным сьветаглядам. Палітычнае жыцьцё беларускага народу ніколі не асягне сваей найвышэйшай формы, калі яно будзе будавацца людзьмі з маскоўскім, польскім, ці іншым не беларускім культурным сьветаглядам. Гэта павінна быць абсалютна ясным, бо тады ў палітычную форму ад пачатку будзе ўкладацца чужы зьмест і ўвесь будынак будзе мець фундаманты зь пяску. Рознабаковая адбудова беларускага жыцьця можа толькі тады памысна разьвівацца, калі яе будуць праводзіць людзі з адпаведным беларускім культурным сьветаглядам.

Ад старое беларускае культуры нас аддзяляюць сяньня вякі, у працягу каторых наш народ з культурнага гледзішча перажыў вельмі многа. Ці перажытыя апошнія стагодзьдзі былі вякамі поступу беларускае культуры, вякамі дасканаленьня беларускага культурнага тылу? На гэтае пытаньне можа быць толькі нядвузначны, нэгатыўны адказ. Мы вельмі аддаліліся ад свайго старога культурнага тыпу, для многіх з нас ён ёсьць ужо нават незразумелым і вельмі далёкім, але мы не здабылі нічога новага, што з крывіцкага культурнага гледзішча было-б карысным. Па дарозе, мы вельмі многа страцілі, а ўзамен назьбіралі ўсялякага сьмяцьця, у якім ня так лёгка адрозьніць сваё ад чужога, карыснае ад шкоднага, вартаснае ад бязвартаснага. Гэты «поступ» зайшоў так далёка, што калі-б мы сяньня паставілі пытаньне, ці ёсьць у нас масавы беларускі культурны тып, самабытны, заходня-эўрапэйскага характару, як гэта было ў мінуласьці, дык пасьля доўгіх хістаньняў, усёж, трэба было-б адказаць нэгатыўна. Ён ёсьць у тэорыі, мае нямала прадстаўнікоў, але ён ня ёсьць масавым. Апошнія стагодзьдзі паднявольнага жыцьця народу пакінулі нам у спадчыне вельмі многа «заходніх» і ўсходніх астачаў, каторыя моцна скалечылі наш стары, чысты, беларускі культурны тып. Мы скажам нават больш — культурныя ўплывы апошніх стагодзьдзяў скалечылі псыхолёгічную язьвь народу. Ідэнтыфікаваць сучасны

kamunikat.org

наш псыхолёгічны тып з мінулым, а вышэй разгледжаным, можна толькі зь вялікімі засьцярогамі і, зразумела, не на карысьць сучаснага. Найглыбей сягаючыя зьмены прынёс нам маскоўскі ўсход.

Ужо сам факт, што Беларусь так доўга знаходзілася пад маскоўскім панаваньнем, можа сьветчыць, што апошняе павінна было пакінуць у нас свае насьледкі. І яно іх пакінула. Маскоўскія культурныя ўплывы, дзякуючы сваей поўнай процілежнасьці заходня-эўропэйскім асновам культурнага й псыхолёгічнага сьветагляду, на якіх будавалася старая беларуская культура, прынесьлі нам асабліва прыкрыя насьледкі й руіну. Справа ў тым, што маскоўскія ўплывы, як усходнія, разбуралі ня толькі будынак, але самыя фундамэнты беларускае культуры, а праз гэта аддзеівалі на перараджэньне беларускае псыхікі. Маскоўскія ўплывы нішчылі ў беларускай душы гон да поступу, да дасканаленьня, ініцыятыву, а прыносілі з сабой азнакі ўсходняе псыхікі — застой, бязвольнасьць, фаталізм нялюдзкае ідэі, дэспотыю. Апошнія прышчэплівалі нам расейская школа, расейскі духоўнік, інтэлігенцыя, ураднік, пан, літаратура. Гэтыя ўплывы пакінулі найглыбейшыя сьляды там, дзе маскоўскае панаваньне трывала найдаўжэй. Бяручы стары беларускі культурны тып як крытэрый, можна вельмі лёгка сьвердзіць гэтыя сьляды.

Возьмем хоць-бы так шырака распаўсюджаную ў беларускім народзе сяньня пасыўнасьць, адсутнасьць ініцыятывы, злучаную нават зь бязвольнасьцю. Гэтыя маскоўскія прыкметы проста ўеліся ў псыхолёгічную йстоту беларускага народу. Іх можна выкрыць на кажным шагу. Вякамі Масква забівала ў беларускім народзе ймкненьне да прагрэсу, ідэалізм, свабодную волю й рабіла гэта мо не таму, што адчувала да нашае культуры спэцыяльную ненавісьць (хоць і гэта было), але проста таму, што нічога іншага з натуры сваёй рабіць не магла. Масква, ці гэта царская, ці чырвоная, магла цярпець толькі бязвольнага чалавека, чалавека-машыну, прызначаньнем якога было быць сьляпым аружжам у руках дэспата, як носьбіта фаталістычнае ідэі. Усё, што выламвалася з гэтых абручоў, было ў пачатку ліквідавана й ня толькі ў нас, але ўсюды, куды сягала маскоўская рука, нават у самой Маскоўшчыне.

Гэткім парадкам Масква забівала ў нашай псыхіцы пачуцьцё чалавечае годнасьці, узгадоўвала ў ёй камплекс чалавечай ніжэйшасьці ў адносінах да кажнага, хто гіерархічна стаяў бліжэй да «бога» — носьбіта ідэі. І гэта аднолькава правільна так у адношаньні да «простага» народу, як і інтэлігенцыі.

Прыгледзімся, напрыклад, да інтэлігента з расейскай, усходняй культурай. Што гэта за чалавек, што за тып? Гэта чэхаўскі чалавек у футарале, гэта прадмет. Ён няздольны да ніякае грамадска – культурнае ініцыятывы, ён ня мае радасьці жыцьця, творчасьці, ён на ўсіх, а ў тым ліку і на сябе, толькі плюе. Ён здольны толькі паслухмяна йсьці на рэзь, але ніколі не змагацца. Ён усяго баіцца, ён вечна шукае, дзе ёсьць тая фатальная сіла, каторая пераможа, каб за ланцуг, які ён ахвотна прыймае, мець магчымасьць зрабіць сваю маленькую, у сутнасьці нікому непатрэбную, кар'ерку. На людзей волі, адвагі, энэргіі, ён глядзіць, як на дзівакоў, здольны, быццам, іх крытыкаваць, ніколі насьледаваць, але гатоў зараз-жа, калі гэтыя людзі перамагаюць, абярнуцца ў іхняга раба, з адзінай мэтай захаваць сваё жыцьцё, у лепшым выпадку сваёй сям'і, бо, хоць ён ня мае жыцьцярадаснасьці, але усё-ж «жить ведь хочется». Што такі тып ёсьць агульна-расейскім, можна сказаць — нацыянальным, аб гэтым ня трэба шмат разводзіцца. Жыцьцё дае нам багатае дазнаньне з гэтага гледзішча, а найлепшым доказам ёсьць тут мастацкая расейская літаратура, якая дасканальна аддае расейскага інтэлігента ў толькі што разгледжаным сэньсе. Калі мы спатыкаем, часам, інтэлігента з расейскай культурай, які ня мае гэтых свомасьцяў, дык прычына гэтага ляжыць у тым, што або яго паходжаньне не маскоўскае, або ён спаткаўся з культурай заходняй, якая акілзала ў ягонай душы лішнія сымпатыі да маскоўскае культуры, накш кажучы перамагла апошнюю.

Усё тое, што мы наглядаем у інтэлігента з маскоўскай культурай датычыць простага народу, што знаходзіўся пад расейскім уплывам, толькі ў апошняга, зразумела, гэтыя свомасьці выступаюць ня так размавіта, багата. Але ў адным і другім выпадку гэта зьявішчы глыбока ад'емныя ў нашым культурным жыцьці.



KAMUNIKAT.org

Як праяў усходніх маскоўскіх уплываў трэба разглядаць даволі часта выступаючую ў нас адсутнасьць пачуцьця собскае годнасьці, на мейсца якой буйна ўзгадавалася пачуцьцё ніжшыні, грэблівае, а толькі ў лепшым выпадку, абыякавае адношаньне да ўсяго, што сваё. Гэтая азнака вельмі характэрная для культурнага тыпу расейскага, які заўсёды адносіўся да ўсяго што чужое, зь піетызмам і таптаў сваё, хоць яно было часта шмат вартасьнейшым.

Пабач з усходняй маскоўшчынай на беларускі культурны тып даволі паважны ўплыў у апошніх стагодзьдзях няволі мела польшчына.

Польская культура — гэта бязумоўна эўрапэйская. Аднак, дзякуючы спэцыфічным рысам польскага псыхолёгічнага тыпу, галоўна-ж адсутнасьці ў ім здольнасьці захаваньня псыхічнае раўнавагі, польская культура выказвае моцную тэндэнцыю да орыенталізацыі, якая праяўляецца ў заўсёдным шуканьні якойсь ідэі — fixe, каторая апаноўвае ўвесь культурны сьветагляд паляка. Гэтыя своеасаблівыя ідэі ня маюць усходняга фаталістычнага, абстракцыйнага характару, яны паходжаньня эўрапэйскага, але іменна адсутнасьць псыхічнае раўнавагі ў польскім тыпе дазваляе некаторым ідэям на польскім груньце дэгенэравацца, і хваравіта вырастаць коштам іншых. Гэта у рэзультаце прыносіць дэгэнэрацыю культурнага жыцьця. Ведама напрыклад дзікое захопленьне палякоў у мінуўшчыне станам анархіі («liberum veto»), каталіцкай ідэяй. Адно й другое маюць, бязумоўна, эўрапэйскае паходжаньне, але на польскім груньце яны прынялі монструальныя форму й зьмест і праглынулі ўсё польскае культурнае жыцьцё. І ў навейшых часох, ужо ў гэтым стагодзьдзі, хто наглядаў польскае жыцьцё мог пераканацца аб нямінучым і хуткім выяўленьню польскае культурнае язьні, каторая аддавалася часткова старым, а часткова новазнойдзеным варыяцкім ідэям.

Польская культура з гледзішча асаблівасьцяў польскага псыхолёгічнага тыпу, ня можа разьвівацца самастойна, а патрабуе чужога кіраўніцтва. Гэтае кіраўніцтва павінна направіць, а вярней дапоўніць у культурным жыцьці нястачы польскага псыхічнага тыпу. Яно павінна ўнесьці духовую стабілізацыю, раўнавагу, якіх ня мае паляк. Вось чаму нас не павінна дзівіць, што польская



kamunikat.org

культура найбуйней разьвівалася тады, калі палякамі кіравалі чужынцы з адпаведнымі псыхічна — культурнымі свомасьцямі. Ведамы ёсьць буйны развой польскае культуры ў пару панаваньня ў Польшчы Ягайлавічаў. Апошнія, як яскравыя прадстаўнікі беларускага псыхічнага й культурнага тыпу, уносілі ў польскае жыцьцё вышменаваныя духовую раўнавагу, стабілізацыю, чым добра рэгулявалі польскае культурнае жыцьцё, паўстрымоўваючы яго ад захопу ідэямі — fixe. У што абярнулася польскае культурнае жыцьцё, калі нястала гэтага беларускага кіраўніцтва, ведама такжа добра зь гісторыі. Часы, каторыя наступілі пасьля Ягайлавічаў, — гэта часы найвялікшага ўпадку Польшчы, поўнае духовае дэгэнэрацыі.

Польскі культурны ўплыў не падважаў эўрапэйскіх культурных асноў беларускае культуры, бо й польская культура мела тыя-ж асновы. Але пэўныя прослані, галоўна вышэйшыя, нашага грамадзянства ён асыміляваў культурна, а з гэтым заўсёды й палітычна. Зразумелая рэч, што польскія ўплывы на наш культурны тып былі без параўнаньня меншыя за маскоўскія. У асобнасьці мы не знаходзім абсалютна ніякіх доказаў таго, каб гэтыя ўплывы закранулі наш псыхічны тып, як гэта зрабілі маскоўскія, аб чым было вышэй. Гэта толькі культурны й палітычны налёт.

Калі мы цяпер вернемся да пытаньня — ці ў абліччы тых зьменаў, каторыя выклікалі ў нашым культурным тыпе апошнія стагодзьдзі варожых чужых уплываў, існуе патрэба навароту да старых эўрапэйскіх традыцыяў беларускае культуры, да гадаваньня новага беларускага культурнага тыпу на слаўных фундамэнтах мінуўшчыны, дык на гэта адказ можа быць толькі пазытыўны. Паміма таго, што сёньня слова «Эўропа», «эўрапэйскі» выдаецца нам амаль чужым, вельмі мала выясьненым, нязнаным, дык, усё-ж, у нас засталося так многа эўрапэйскіх культурных астачаў, што значна лягчэй будзе іх упарадкаваць збудаваць на старых традыцыях нашае культурнае жыцьцё, як нагінаць нашую культуру пад ўсходнія, маскоўскія, або тым болей заходнія польскія асновы. Хоць сьведамага эўрапэйскага культурнага тыпу ў масавым значэньні мы яшчэ ня маем, але мы маем старыя культурныя фундамэнты, каторыя яшчэ моцна захаваліся й на якіх мы можам



KAMUNIKAT.org

узьнесьці свой культурны будынак. Што гэтыя фундамэнты йснуюць, нас пераконвае хоць-бы вялізарная культурная адпорнасьць беларуса на чужыя ўплывы. Мы й сяньня ня можам сабе напр. уявіць, каб хтось з нашага культурнага грамадзянства важыўся прысабечыць зь мінуўшчыны асобу, каторая паходзіла скажам з Маскоўшчыны або Кіева, Польшчы, якой-бы вялікай яна ня была. Гэта нават у тым выпадку, калі яна дзеіла на Беларусі. Гэты інстынкт, які ачышчае нашую культуру ад засьмечаньня чужым дабром, пераконвае нас у тым, што старыя культурныя фундамэнты ў беларускім народзе захаваліся й да сяньня вельмі моцна, што іх ня збурылі ворагі й што тымбалей нятрэба іх бурыць нам.

Мы павінны адкінуць той забабон, каторы часта сяньня спатыкаецца, а які палягае на тым, што некаторыя з нас думаюць, што нам нехта можа «прынесьці» эўрапэйскую культуру, можа нас «далучыць» да Эўропы. Ніхто нам гэтае культуры прынесьці, або нас «з'эўропэізаваць» ня можа, хоць-бы з тэй простае рацыі, што мы ад пачатку сваёй багатай гісторыі зьяўляемся эўрапэйцамі ў найчысьцейшым разуменьні гэтага слова, а сяньня мы павінны толькі саскрабаць той налёт, каторы да нас прынеслі чужыя ветры. Мы павінны, такжа, ведаць, што нашая культура ў вялікай сямьі эўрапэйскіх культураў ёсьць самабытнай і займае між імі пачэснае месца. Мы маем свае собскія асновы культурнага разьвіцьця, якія павінны пазнаць і іх гадаваць, а ні ў якім выпадку не мяняць на іншыя, бо гэта азначала-б для нас культурную, а за ёй і нацыянальную сьмерць, на што мы ніколі пайсьці ня можам.

Паколькі пытаньне ўзгадаваньня культурнага беларускага тыпу выясьнена ў тым эсэ, што яно павінна вярнуцца да эўрапэйскіх самабытных асноў нашае культуры, патолькі ўзрастае вага студыяў нашае мінулае культуры, нашага гістарычнага культурнага тыпу. Прынцыповае значэньне мае тут сам мэтад студыяў нашае культуры ў мінуўшчыне, самы падход да яе, які мы прадставілі вышэй і які павівен запанаваць так у нашых гістарычных досьледах собскае культуры як і ў навучаньню яе сучасных генэрацыяў. Усякія іншыя чужацкія канцэпцыі павінны быць раз назаўсёды адкінены.

## РЭЛІГІЙНАЕ ПЫТАНЬНЕ

Справа досьлёдаў рэлігійнага пытаньня ў мінуўшчыне Беларусі ня мае такжа адналітага падходу. А між тым рэлігія згуляла ў нашай гісторыі вельмі важную ролю, пазнаньне якой можа нам высьветліць шмат мамэнтаў у мінуласьці, каторыя й да сяньня выдаюцца няяснымі.

Справа рэлігіі ў першым пэрыёдзе гісторыі Беларусі выглядала проста й вывучэньне яе не спаткае вялікшых труднасьцяў, калі, зразумела, захаваўся адпаведны матарыял. Ведама, што хрысьціянства ў Беларусь прыходзіла з захаду й з усходу яшчэ да 988 г., які ў нас некаторыя гісторыкі склонны разглядаць як афіцыяльную дату хросту Беларусі. Яно тут мірна ўжывалася з паганскай рэлігіей, толькі паступова выціскаючы апошнюю. Што датычыць даты 988 г., дык яна можа быць разглядана толькі як сымбалічная дата хросту Беларусі й тое зь вялікай нацяжкай. Яшчэ шмат пазьней у Беларусі спатыкалася паганства, прынамся сільныя яго астачы. Ня можа быць сумлеву, што, прыкладам, у заходняй часьці Беларусі, там дзе нарадзілася суцэльная беларуская гаспадарсьцьвенасьць (Слонімшчына, Ваўкавышчына, Гарадзеншчына й Наваградчына) першабытная паганская народная рэлігія йснавала яшчэ ў палове XШ ст. у поўнай меры, хоць тут было ўжо распаўсюджана й хрысьціянства. Апошняе прынялося ў нас ува ўсходнім абрадзе. Заходні прыйшоў пазьней. Неабходна зьвярнуць увагу на факт, што хрысьціянства пашыралася ў нас не гвалтам, «агнём і мячом», як гэта мела месца шмат дзе на захадзе і ўсходзе, а зусім мірным шляхам, што, ёсьць такжа характэрным праявам вышай разгледжанага псыхолёгічнага тыпу крывіча, які ня зносіць гвалту ў ніякай яго форме. Мы ня можам знайсьці ніводнага крывіцкага князя нават з пары сярэднявечча, каторы-б займаўся шырэньнем хрысьціянства шляхам войнаў, вынішчэньня паганых. Крывіцкія князі не рабілі гэтага ня толькі ў сябе дома, што магло быць больш зразумелым, але нават і сярод тых народаў, каторыя сабе падпарадкавалі. Так, калі ў палове XII ст. у складзе Полаччыны апынуліся сяньняшняя Літва й Латвія, населеныя тады паганскімі народамі чужога крывічом паходжаньня, яны захапалі свае народныя паганскія вераваньні ў поўнай меры й ніхто іх не

KAMUNIKAT.org

змушаў да прыйманьня хрысьціянства. З гэтага гледзішча трэба зьвярнуць увагу на сьветчаньні крыжацкіх летапісаў, у якіх гаворыцца, што полацкія князі абмяжоўваліся толькі да зьбіраньня з гэтых народаў дані, але не прымушалі іх пераходзіць у хрысьціянства.

Гэткім чынам, ужо ў пачатку нашае гісторыі, у пару найцямнейшага сярэднявечча, калі рэлігійнае пытаньне ўсюды было аднэй з найважнейшых прычынаў розных збройных закалотаў, у нас ужо панавала ралігійная талеранцыя, каторая ў пазьнейшыя стагодзьдзі адбыла сваю багатую эвалюцыю. Неабходна зьвярнуць увагу на вялізарную розьніцу з гэтага гледзішча між сярэднявечнай Крывіей, а яе суседзямі так з усходу, як і заходу.

Дзякуючы асаблівасьцям беларускаепсыхікі, само хрысьціянства выглядала ў Крывіі ад свайго пачатку зусім накш, як на ўсходзе, або захадзе. Тут яно ня мела ніякіх азнак ваяўнічасьці. І хоць ад свайго пачатку, яно было ў нас распаўсюджана, ува ўсходнім абрадзе, але яно мела вялікія заходнія ўплывы. Хрысьціянства ў Беларусі было чымсь пераходным ад заходу да ўсходу. Характэрна, што, прыкладам, сьв. Прадслава была залічана ў лік сьвятых і каталіцкім касьцёлам, праўда акольным шляхам, і пад іншым іменем, але ўжо ясна даказана, што тут ішло аб адну й тую самую асобу. Яно ня мела ў нас суровага аскетычнага характару. Зьвяртае ўвагу цікавы факт, што ў нас не разглядалася як нешта варожае выкладаньне хрысьціянскае веры з тасаваньнем асноў клясычнае грэцкае філёзофіі, аб чым можа сьветчыць хоцьбы прыклад Клімента Смаляціча. І хоць некаторыя расейскія гісторыкі царквы хочуць гэта разглядаць як прыпадак, ня меўшых глыбейшага значэньня, дык усё ж, прыймаючы якраз пад увагу глыбокую талеранцыйнасьць у нас хрысьціянства да паганскай крывіцкай веры, зусім ня было-б дзіўным тлумачэньне асноў храсьціянства з пакліканьнем на Гомэра, Арыстотэля, паколькі іх ведалі хоць у агульных нарысах.

Ад часоў Ягайлы да нас прыходзе рыма-каталіцтва ў шырэйшых разьмерах. Яно распаўсюджваецца, галоўным чынам, сярод вышэйшых прасланяў народу — магнатаў і баярства. Характэрна,

што рымакаталіцтва, якое да нас ішло з Польшчы, нясло з сабой і тыпова польскую сваю азнаку — нецярпімасьць да іншых веравызнаньняў. Адразу, за Ягайлы, зьявіўся закон, які забараняў не-каталікам займаць вышэйшыя ўрады ў гаспадарсьцьве. Гэты закон ўва ўмовах беларускага жыцьця ня меў практычнага значэньня, а па нейкім часе быў скасаваны зусім, аднак паказальным ёсьць сам факт яго зьяўленьня на беларускім груньце, бо гэта цікавы доказ глыбокае розьніцы ў падыходзе да рэлігійнага пытаньня ў беларусаў і палякаў.

Калі ў XV ст. на захадзе зьявілася рэфармацыя, яна была занесена й да нас. Найбуйнейшым яе прадстаўніком быў князь Мікалай Радзівіл Чорны. Рэфармацыя (перадусім кальвінства) ахапляла ў нас, такжа, толькі вышэйшыя слаі насельніцтва — магнатаў, баяраў і наагул адукаваных людзёў. Годзі заценіць, што яна была ў нас, усё-ж, зьявішчам сэзоновым і хутка перажыла пару свайго буйнага разьвіцьця.

Ад канца XVI ст. у нас зьяўляецца вунія, каторая здабыла сабе права трэцьцяга побач з праваслаўем і каталіцтвам веравызнаньня ў гаспадарсьцьве. Яна аказалася ў нас зьявішчам трывалым і ў барацьбе за йснаванъне, галоўна з праваслаўем, здабыла вялікія сукцэсы. Паколькі рыма-каталіцтва й кальвінства былі веравызнаньнямі перадусім пануючых слаёў насельніцтва, патолькі вунія, менш аб тое, якімі спосабамі, глыбака закранула «просты» народ — беларускае мяшчанства й сялянства. У сваей барацьбе зь іншымі веравызнаньнямі вунія вырозьнівалася вялікай ваяўнічасьцю.

Наагул, калі мы зьвернем увагу на эвалюцыю рэлігійнае справы ў Беларусі ў пару яе незалежнага йснаваньня, дык трэба сьцьвердзіць, што гэтая авалюцыя была чымсь асаблівым, характэрным толькі для таго камплексу культурна — палітычных адносінаў, які паўстаў на Беларусі. Нідзе, ані на захадзе, ані на ўсходзе, ня было нічога падобнага. На чым палягала гэтая своеасаблівасьць эвалюцыі рэлігійнае справы ў нас?

Нельга, зразумела, пярэчыць, што як усюды на захадзе, або ўсходзе, сьветагляд крывіча ня толькі ў пару сярэднявечча, але й да канца йснаваньня беларускае гаспадарсьцьвенасьці быў рэлігійны

KAMUNIKAT.org

ў хрысьціянскім, ясна, сэньсе. Рэлігія тлумачыла й культурнаму крывічу паходжаньне сьвету, чалавека, народаў, штодзённых зьявішчаў прыроды, давала яму рады ў практычным жыцьці й разьвязвала адвечную філёзофічную загадку жыцьця пасьля сьмерці. Усё было ясна й проста. Выразныя сьляды рэлігійнага сьветагляду мы знаходзім ува ўсёй нашай культурнай спадчыне. Аднак, калі на захадзе рэлігійны сьветагляд фармаваўся пад уплывам перш рыма-каталіцтва, а пазьней рэфармацыі (кальвінства, лютаранства), а на ўсходзе ў Маскве праваслаўя — кажным разам пад уплывам нейкай канкратнае царквы, канкрэтнага веравызнаньня, якія й выціскалі свае асаблівасьці на фармаваным імі рэлігійным сьветаглядзе, — у нас ён складаўся пад уплывам філёзофіі рэлігіі наагул, а ня якогась канкрэтнага веравызнаньня. Рэлігійны сьветагляд, асабліва культурнага беларуса, базаваўся на асновах рэлігіі як агульнага духовага зьявішча ў жыцьці чалавецтва й не інтарасаваўся розьніцамі між асобнымі веравызнаньнямі, што кансэквэнтна выплывала з псыхолёгічнае азнакі беларуса — заўсёднага шуканьня вечнае, аб'ектыўнае праўды, справядлівасьці. Згэтуль бярэ свой пачатак і тая бяспрыкладная рэлігійная цярпімасьць, якая йснавала ў беларуса, паміма таго, што ягоны сьветагляд быў, усё-ж, глыбока рэлігійным! Дасьледчык гэтае квэстыі знойдзе ў нашай мінуўшчыне безьмяр прыкладаў гэтае талеранцыі. Мы ўспомнім тут хоць-бы гэткія факты, як фундаваньне беларусам-каталіком, побач з касьцёламі й праваслаўных цэркваў (сам гаспадар Казімер Ягайлавіч, каталік, набудаваў аж 40 праваслаўных цэркваў у чэсьць сьв. Ільлі за тое, што ягоная жонка цудам ратавалася ад сьмерці якраз у дзень праваслаўнага сьвята Ільлі), багатыя адказы ў тэстамэнтах беларусамі —каталікамі на карысьць праваслаўных, ці вуніяцкіх цэркваў і наадварот і г. д. А ўжо клясычным сфармуляваньнем асноў беларускага рэлігійнага сьветагляду й выплываючае зь яго талеранцыі беларуса ёсьць гэткі дакумэнт, як ліст Лявона Сапегі да Язахвата Кунцэвіча (які мы ўжо мелі нагоду падаць у працы «У трохсотлетнія ўгодкі сьмерці вялікага канцлера Лявона Сапегі» — Гадавік Бел. Нав. Т-тва, Вільня, 1933). Гэты дакумэнт ёсьць клясычным доказам таго, што беларус шукаў



KAMUNIKAT.org

у рэлігіі іменна толькі асноў вечнае, аб'ектыўнае праўды. Ён інтарасаваўся толькі філёзофіей рэлігіі, як такой і з гэтага гледзішча шукаў у апрычоных хрысьціянскіх веравызнаньнях толькі тое, што было супольным, бо яно стаяла бліжэй да гэнае аб'ектыўнае праўды й адкідаў розьніцы, бо яны былі ад яе далей. Вось чаму ў часы, калі на захадзе і ўсходзе, дзе рэлігійны сьветагляд так адзінкі як і народу складаўся пад уплывам аднае, але заўсёды канкрэтнае царквы ці касьцёлу, з прычыны рэлігійных розьніцаў вяліся найбольш крывавыя ў гісторыі чалавецтва войны й прасьлядаваньні, у нас былі магчымымі гэткія праявы рэлігійнае цярпімасьці, да якой іншая Эўропа дайшла толькі пасьля доўгае эвалюцыі. Трэба мець тут на ўвеце, што польская гісторыёграфія вельмі часта падчырквае славутую польскую рэлігійную талеранцыю. Калі, аднак, сягнуць да жаролаў гэтага цьверджаньня, дык выявіцца, што яна або прысабечвае тут цярпімасьць беларускую, або мае на ўвеце тую пару, калі ў Польшчы панавала дынастыя Ягайлавічаў, прадстаўнікі якой сваімі псыхолёгічнымі крывіцкімі свомасьцямі паўстрымоўвалі польскае жыцьцё ад захапленьня ідэямі-fixe, ад запанаваньня ў ім рэлігійнае неталеранцыі. Як выглядадала польская талеранцыя, калі нястала гэтага крывіцкага кіраўніцтва, можа светчыць распаленая палякамі ў сябе і ў нас рэлігійная барацьба, і гэткія, прыкладам, факты, што польскія соймы яшчэ ў канцы XVIII ст.. наконадні згубы Рэчыпаспалітай, займаліся выдаваньнем канстытуцыяў у якіх «схізматыкам» дазвалялася весці хаваць сваіх нябошчыкаў толькі тымі вуліцамі, якімі вывозілася сьмяцьцё.

Аднак гэты інтэрас беларуса да філёзофіі рэлігіі, малое, або поўнае незьвяртаньне глыбойшае ўвагі на йснаваўшыя ў Беларусі веравызнаньні наагул і іхнія ўзаемаадносіны ў асобнасьці з гледзішча нацыянальна-палітычнага прынясло вялізарную шкоду народу і ў вялікай меры пахіснула асновы беларускае гаспадарсьцьвеннасьці. Справа ў тым, што рэлігія была ня толькі крыніцай, у якой можна было шукаць аб'ектыўнае праўды, але, паколькі яна фармавала сьветагляд адзінак і народаў, зьяўлялася першараднае вагі ўзгадавальным дзейнікам. Заходня-эўрапэйскія народы й Масква, сьветапагляд якіх вырабіўся пад уплывам



KAMUNIKAT.org

канкрэтнае царквы, а не філёзофіі рэлігіі, духова зрасьліся з сваім веравызнаньнем і ў пару свайго нацыянальна-палітычнага дасьпяваньня і ў поўнай меры выкарыстаалі рэлігійны дзейнік як магутную духовую зброю ў каваньні нацыі. Сказаць выкарысталі — ня зусім точна. Ён сам да іх прыйшоў. Ён сам у вялікай ступепі пераняў кіруючую ролю ў працэсе твараньня нацыі, а ў кожным выпадку не стаяў збоку й не прыглядаўся гатаму працэсу пасыўна. Так у навейшую пару гісторыі, калі складаліся нацыі ў сучасным разуменьні гатага слова мы бачым, як у народаў заходняе Эўропы паўстаюць г. зв. «нацыянальныя», або «народныя» касьцёлы, каторыя пачынаюць адыйгрываць вельмі важную палітычную ролю зь якой зусім і не хаваюцца. Нацыянальныя касьцёлы паўсталі блізу ўва ўсіх гаспадарствах заходняе Эўропы і ў Маскве. Мы спатыкаем іх, прыкладам, у Польшчы, Нямеччыне, Чэхіі, Францыі, Англіі, Швэцыі й г. д. Паўсталі яны або дзякуючы рэфармацыі, або ролю гэтую пераймаў унівэрсальны каталіцкі касьцёл, каторы прытарноўваўся да мясцовых умоваў і рабіўся запраўдным пацыянальным касьцёлам. Так было, прыкладам, у Францыі, Польшчы, дзе рыма-каталіцтва пайшло насустрэч дзейнікам, выклікаўшым фармаваньне нацыі й адыйграла выдатную ролю ў яе тварэньні. У Маскве нацьянальнай царквой сталася праваслаўная царква, каторая ў маскоўскіх умовах прадбыла зусім адменныя азнакі. Праўда, у некаторых краінах, як Нямеччына, мы ня бачым аднаго касьцёлу, бо побач зь лютаранствам, тут засталося й рыма-каталіцтва. Але апошняе на нямецкім грунце здабыло тыпова нямецкі характар і як такое, побач зь лютаранствам, уплывала на фармаваньне нямецкае нацыі. Роля нацыянальных, або народных, касьцёлаў у фармаваньні сучасных нацыяў палягала на тым, што яны, парваўшы зь сярэднявечным процістаўленьнем інтарэсаў касьцёлу інтарэсам гаспадарства, безапэляцыйна падпарадкавалі першыя апошнім. Гэткім чынам яны сьціравалі масавы духовы потэнцыял, якім дыспанавалі, на будову нацыянальнасьці й нацыянальнае гаспадарсьцьвенасьці. Побач з гэтым, яны шырылі сьведамасьць патрэбы рэлігійнага адзінства ў народзе, ідучы ў гэтым так далёка, што нат' заціралі розьніцу між рэлігіей і нацыей. Не паклікаючыся

kamunikat.org

на далейшыя прыклады, досыць успомніць прыклад Польшчы, дзе такі Скарга пашыраў з усей ваяўнічасьцю тэзу, што паляк можа быць толькі каталіком і наадварот — кажны каталік — гэта паляк. Скарга, натуральна, ведаў, што, асабліва апошняе цьверджаньне, ёсьць няпраўдай але ўва ўмовах, у якіх ён дзеіў, гэта ня мела значэньня. Яму йшло передусім аб палянізацыю беларускіх каталікоў і тут ён мог праводзіць сваю тэзу без усялякіх агаворак.

Гэткім парадкам нацыянальныя касьцелы, аддаючы ўвесь аўтарытэт рэлігіі на службу інтарэсам сваей нацыі, да часу зьяўленьня спэцыяльных навуковых трактатаў аб нацыі й гаспадарсьцьве, у пераходны мамэнт тварылі свайго роду сурагат нацыянальна-гаспадарсьцьвенай ідэёлёгіі. Там, дзе нацыянальны касьцёл у гэтым разуменьні не паўстаў, фармаваньне нацыі вельмі спозьнілася. Гэта мы бачым хоць-бы на прыкладзе Італіі, дзе рымакаталіцызм, з прычыны мо' знаходжаньня тут яго цэнтру, значна даўжэй, як на пэрыфарыях Эўропы, захаваў свой унівэрсальны характар.

Дасьлядуючы эвалюцыю рэлігійных (адносінаў у Беларусі з гэтага гледзішча трэба сьцьвердзіць, што ў нас ад пачатку вытварыліся адносіны, каторыя выключалі магчымасьць паўстаньня аднаго крывіцкага касьцёлу, як нацыянальнага. Аж да сьмерці Альгерда магло выдавацца, што гэтая роля прыпадзе праваслаўнай царкве.

За Гедыміна й Альгерда праваслаўная царква ў Беларусі (Вялікім Княсьцьве Літоўскім) была вылучным веравызнаньнем, ня мела ніякіх канкурэнтаў, здабыла найвышэйшую арганізацыйную форму — собскую мітраполію й карысталася ўсебаковай апекай гаспадарства. Пры падтрымцы дзяржавы, наглядалася нат тэндэнцыя да змаганьня з Масквой за прымат уплываў ува ўсходнім хрысьціянскім сьвеце, паколькі адбывалася барацьба за мёртвы ўжо тытул кіеўскага мітрапаліта між беларускай і маскоўскай царквой. Але ўжо па сьмерці Альгерда выяснілася, што праваслаўная царква ня мае пэрспэктывы стацца нацыянальнай крывіцкай царквой. Перадусім яна ніколі ня выдзеліла з свайго асяродзьдзя сільных адзінак, каторыя поўнасьцю-б зразумелі яе ролю ў жыцьці народу й гаспадарства,

KAMUNIKAT.org

а па-другое — ужо ад Ягайлы ў Беларусі пачало шырыцца, каталіцтва, каторае пpыняла дынастыя, а за ёй і ўплывовыя ў гаспадарсьцьве ўрадавыя колы. Праваслаўе хутка пагадзілася з роляй раўнапраўнага з каталіцтвам веравызнаньня й ня мела ніякіх іншых амбіцыяў. Было, аднак, ад пачатку ясным, што й каталіцтва ў нас не падыймецца да ролі народнага касьцёлу ўжо хоць-бы з тэй прычыны, што яно, паміма сільных азнак самабытнасьці, выступаўшых яшчэ ў пачатку XVII ст., дзякуючы масаваму даплыву польскага з паходжаньня духавенства, наагул паступова губляла свой крывіцкі (літоўскі) характар і ставалася ўсё больш звычайным адгаліненьнем польскага каталіцкага касьцёлу. Кіраўніцтва каталіцкага касьцёлу ў Беларусі апынулася памалу ў руках польскага духавенства, якое разглядала яго, выключна як аружжа полёнізацыі, паводле цьверджаньня Скаргі, што кажны каталік — гэта паляк. У гэткіх умовах каталіцтва не магло зрабіцца ў нас народным касьцёлам.

Эвалюцыя рэлігійных адносінаў на Захадзе ў кірунку падпарадкаваньня інтарэсаў рэлігіі гаспадарству, нацыі праз твараньне народных касьцёлаў, была добра ведама беларускаму адукаванаму грамадзянству. Яно разумела, такжа, вагу гэтых падзеяў, аднак не здабылося на адну згодную рэакцыю. Мы наглядаем у нас два кірункі ў тагачаснай рэлігійнай палітыцы. Адзін зь іх, якога трымалася вялізарная бальшыня адукаванай прослані народу, а які ў сутнасьці вызнаваў філёзофію рэлігіі, адносіўся да рэлігійнага пытаньня, наагул, абыяка. Гэты кірунак рэлігійную палітыку будаваў на аснове поўнае цярпімасьці, прызнаючы права на йснаваньне ў гаспадарсьцьве кажнаму веравызнаньню, кажнай рэлігійнай «навінцы». Тыповым, напрыклад, прадстаўніком гэтага кірунку быў ужо неаднойчы ўспаміналы канцлер Леў Сапега, дзейнасьць якога прыпадае якраз на найбольш адказную з гэтага гледзішча пару ў нашай гісторыі. Сам тры разы зьмяніўшы рэлігію, Сапега быў клясычным прадстаўніком крывіцкага філёзофа, рэлігіі, які дасканальна ведаў агульныя асновы хрысьціянства, але ня цівіўся глыбей ніякім веравызнаньнем. Пазнаўшы добра ў часе свайго пабыту заграніцай эўрапэйскія рэлігійныя адносіны, крывавыя змаганьні на

KAMUNIKAT.org

рэлігійным фоне, шкоды, якія яны прыносілі гаспадарству, ён, па звароце на бацькаўшчыну, дзе хутка стаўся фактычным кіраўніком гаспадарства, у сваёй рэлігійнай палітыцы з тым вялікшым пракананьнем пастанавіў кіравацца прынцыпам рэлігійнае таляранцыі. Неабмяжаваная, аднак, цярпімасьць у працягу сараку год Сапегавага кіраваньня прынесла вялікія шкоды гаспадарству й народу. Не інтарасуючыся адносінамі ў абрубе апрычоных веравызнаньняў, а толькі жадаючы ад іх «перасьцяраганьня асноў гаспадарсьцьвенасьці й паспалітага супакою», Сапега не дагледзіў, як на чале асобных веравызнаньняў апынуліся чужынцы, што пры падтрыманьні вонкавых дзейнікаў (перадусім Польшчы, а потым Масквы) паднялі ў гаспадарсьцьве запраўдную вайну ўсіх проціў усіх. Было ўжо позна, калі Сапега спасьцярог сваю памылку. Зь вялікім драматызмам гавора ён аб гэтым сам, калі піша да Кунцэвіча, што ён, праўда й сам дапамагаў увядзеньню вуніі, бо чаму-б у нас, побач зь іншымі верамі, не магла існаваць і яшчэ адна, але яму ніколі ўдум ня прыйшло, што гэта новая вера можа спрычыніць столькі шкоды й непакою ў гаспадарсьцьве... Сапега яшчэ грозіць рэпрысіямі, але ўжо ясна, што ён гэтую справу прайграў. Разам зь ім прайгралі яе ягоныя папярэднікі й наступнікі, што стаялі на груньце неабмяжаванай таляранцыі. Яны не дацанілі таго факту, што рэлігія ў руках варожага й чужога духоўнага кіраўніцтва станецца дзейнікам вялікае руйнуючае сілы й дапусьцілі да гэтага чужога кіраўніцтва, дзякуючы чаму правільны ў сваей аснове прынцып рэлігійнае палітыкі, заместа спадзяваных карысьцяў, прынёс руіну беларускага гаспадарства.

Само сабой зразумела, што гэты кірунак рэлігійнае палітыкі, які ў нас nota-bene заўсёды быў афіцыяльным, ні ў якой меры не інтарасаваўся справай свайго народнага касьцёлу ці царквы. Ягоныя асновы былі нават запярэчаньнем гэтае патрэбы.

Вышэй мы разгледзілі адзін кірунак крывіцкай рэлігійнай палітыкі й падчыркнулі, што ён быў у нас праз увесь час існаваньня незалежнае беларускае гаспадарсьцьвенасьці афіцыяльным. Пры дасьлядаваньню, аднак, рэлігійных адносінаў у Беларусі трэба зьвярцуць увагу на другі кірунак тэй-жа палітыкі, які, хоць і ня быў афіцыяльным, аднак з гледзішча на асобы, якія

яго рэпрэзэнтавалі, ён меў паважны ўплыў на ўкладаньне фактычных рэлігійных адносінаў у Беларусі.

Гэты другі кірунак рэпрэзэнтаваўся людзьмі, каторыя з розных матываў інтарасаваліся глыбей рэлігійнымі справамі й імкнуліся да рэформы рэлігійных адносінаў у гаспадарсьцьве. Трудна цьвердзіць напэўна, што гэты кірунак імкнуўся да стварэньня беларускае нацыянальнае царквы, усё ж, некаторыя даныя сьветчаць, што гэтую тэндэнцыю ён меў. Некаторыя ўплывовыя ў гаспадарсьцьве адзінкі, а нават шырэйшыя грамадзкія колы зь непакоем глядзеліна разьвіцьцё рэлігійных адносінаў у краю, на той рэлігійны падзел народу, які ўсё больш замацоўваўся. Каб папярэдзіць некарыснае разьвіцьцё гэтых адносінаў, яны прапанавалі, а калі мелі магчымасьць, дык і праводзілі ў жыцьцё імі абдуманыя мерапрыемствы. Гэтыя адзінкі й грамадзкія колы асабліва балюча адчувалі падзел народу на праваслаўных і каталікоў, бачылі ўсё ўзрастаючае выкарыстоўваньне гэтага падзелу варожымі гаспадарству вонкавымі дзейнікамі й на гэтай, галоўна, аснове, ймкнуліся да завядзеньня ў гаспадарсьцьве аднае веры. Галоўнай, аднак, перашкодай у гэтым было пытаньне, якая гэта мае быць вера? Была згода, што гэтай верай ня можа быць ані каталіцтва ані праваслаўе, але ня было згоды, што да новай, якая мела-б іх замяніць.

Вялікі патрыёт краю, выдатны гаспадарсьцьвены муж і ваеньнік князь Мікалай Радзівіл Чорны бачыў гэтую новую веру ў кальвінсьцьве. Ён з асаблівай безагляднасьцю пашыраў гэтую веру ў сваіх вялізарных уладаньнях, ды апякаваўся кальвінскімі зборамі ўва ўсім гаспадарсьцьве. Дзякуючы ягоным вялікім уплывам, за кароткі час кальвінства вельмі пашырылася ў Беларусі. Многія й многія сотні выдатных крывіцкіх фаміліяў прынялі гэтую веру, якая нат прымусова ўводзілася сярод сялянства й мяшчанства, паводле ведамага тады прынцыпу — cujus regio, ejus religio.

Дзякуючы масаваму далучэньню да кальвінства крывіцкіх баярскіх родаў, становішча праваслаўя й рыма-каталіцтва ў краі было паважна загрожана. Сярод пашыральнікаў новае веры мы бачым такую выдатную адзінку з нашай мінуўшчыны, як Сымон

kamunikat.org

Будны. Усюды паўставалі кальвінскія друкарні, якія выпушчалі багатую рэлігійную літаратуру, прысьведчаную, галоўна, палеміцы зь іншымі веравызнаньнямі.

Аднак спроба Мікалая Радзівіла канчылася няўдала. Зь ягонай сьмерцю мы бачым такі-ж хуткі заняпад кальвінства ў Беларусі, як хуткім быў ягоны рост. Чым тлумачыцца гэтая няўдача? Гэтая справа патрабуе глыбейшага дасьлядаваньня, але трэба падчыркнуць, што адно з дасюлешніх яго тлумачэньняў выдаецца правільным. Галоўнай прычынай няўдачы была нястача выробленых і адпаведна адукаваных крывіцкіх працаведнікаў гэтага веравызнаньня, дзякуючы чаму Мікалай Радзівіл быў змушаны сьцягваць іх у Беларусь з заграніцы, а галоўна з Польшчы. Дзякуючы гэтаму, уся справа новае веры хутка апынулася ў рукох чужога крывічом элемэнту, які хоць і пашыраў яе з поўнай адданасьцю, але не разумеў крывіцкага інтарэсу ў заводжаньні новае веры. Многія працаведнікі ня ведалі нават беларускае мовы й таму рэлігійную літаратуру часта друкавалі папольску, чым далажыліся да пашырэньня польшчыны. Гаворачы аб лёсе кальвінства ў нас, нельга не зьвярнуць увагі на выпадак, што ўжо сыны Мікалая Радзівіла Чорнага былі навернены ў каталіцтва й аддавалі вялікія сумы грошай езуітам на скуп рэлігійнае літаратуры, выдадзенай іхнім бацькам, якую ўрачыста палілі.

Куды глыбейшай спробай рэформы рэлігійных адносінаў у Беларусі з крывіцкага гледзішча была вунія. Гэта было новае веравызнаньне, істота якога палягала на злучэньню рыма-каталіцтва й праваслаўя — гэтых двух галоўных веравызнаньняў у Беларусі. Новая вера пакідала ўвесь вонкавы праваслаўны абрад, але ўводзіла прызнаньне прымату папы. Трэба зьвярнуць увагу, што думка аб вуніі ўсплыла ўжо ў нас у 1439 г. (г. зв. Флерэнтынская вунія), але тады яна ня мела амаль ніякага рэха ў краі й была закінена на даўжэйшы час аж да Берасьцейскага Сабору у 1595 г.

Калі глыбей спыніцца над прычынамі, якія выклікалі Берасьцейкі Сабор і новую спробу злучэньня царквы й касьцёлу ў Беларусі, дык можна бяз труду сьцьвердзіць тут дваякага роду

KAMUNIKAT.org

матывы, якімі кіраваліся ўдзельнікі Сабору. З аднаго боку быў відавочны моцны ўплыў польскага каталіцкага духавенства, якое бачыла ў вуніі мост, па якім маглі лягчэй перайсьці праваслаўныя ў каталіцтва. Пры гэтым каталіцтва разглядалася менаваным польскім духавенствам як сродак да палянізацыі крывічоў. Польскае духавенства мела на Саборы вялікую падтрымку гаспадара Жыгімонта IV Вазы, заўзятага каталіка, які вырозьніваўся асаблівай нецаляранцыяй да іншых веравызнаньняў.

З другога, аднак, боку, сярод іншых удзельнікаў Сабору, асабліва сярод прадстаўнікоў сьвецкіх, даецца выразна заўважыць падход да вуніі як да крывіцкага нацыянальнага касьцёлу. У іхніх вачох вунія была асабліва таму пажаданай, што будучы ў сутнасьці новай верай, што аддзяляла-б беларусаў ад палякоў і маскалёў, яна, адначасна, уяўляла сабой свайго роду сынтэзу ужо йснуючых у Беларусі веравызваньняў — праваслаўя й каталіцтва. Гэтым тлумачыцца даволі вялікае падтрыманьне вуніі сьвецкім элемэнтам. Іменна з гэтага гледзішча Берасьцейскі Сабор можна разглядаць як спробу стварэньня беларускае народнае царквы.

Аднак справы злажыліся так, што кіраўніцтва вуніі апынулася пад вялікім не беларускім уплывам, хоць вунійная духоўная гіерархія была беларускай. Тлумачыцца гэта тым, што новая вера спачатку знай шласяў надта цяжкіх абставінах і каб перамагчы іх, шукала апорышча вонках у таго-ж польскага каталіцкага духавенства й польскага каталіцкага ўраду, чым давала апошняму яшчэ адну нагоду ўмешвацца ў нутраныя крывіцкія справы. Тут трэба зьвярнуць увагу, што ў першай стадыі свайго разьвіцьця вунія, блізу бесьперашкодна апанавала ўвесь край. Праўда, гэтае апанаваньне выразілася ўва ўстанаўленьні ўсюды вуніяцкага духавенства, але прыймаючы пад увагу, што насельніцтва, ня ўмеючы разабрацца ў розьніцы між новай верай і ранейшым праваслаўем (абрадавая старана засталася тая самая) без апору прыймала вуніяцкае духавенства й новую веру. Аднак дзякуючы ўцягваньню ў справы вуніі палякоў, яна набірала штораз больш ваяўнічага характару, аж у хуткім часе перайшла на шлях перасьлядаваньня праваслаўных. Гэткім парадкам яна ўжо выклікала супроць сябе рэакцыю. Распачалася масавая апастазія ад

kamunikat.org

вуніі, а ў рэзультаце разгарэлася рэлігійная вайна ўва ўсім гаспадарсьцьве.

Новыя здабычы вунія зрабіла ўжо толькі гвалтамі. Тым няменш, яна адолела ахапіць вялікую масу праваслаўных крывічоў. Выкарыстоўваная палякамі, адпіханая з пагардай польскім каталіцкім духавенствам, яна зь цягам часу была ізалявана й хоць прыйшла гвалтам, але паступова акліматызавалася на крывіцкім груньце й сталася, запраўды, беларускай народнай верай. У вуніяцкай царкве найдаўжэй перахавалася й беларуская мова. Аднак, калі вунія ўжо прынялася, настуніў новы гвалт і гэтым разам з боку расейскага ураду ў форме прымусовага наварачваньня вуніятаў на праваслаўе (канец XVIII і XIX ст.). Гэткім парадкам дасьледаваньне рэлігійных адносінаў у Беларусі паказвае, што крывічы ў мінуласьці не маглі справіцца з гэтай так важнай справай. Яна высьлізнулася зь іх рук, і лучыўшы ў варожыя, распаліла агонь нутранога змаганьня ў краі, у вялікай меры далажылася да збурэньня беларускае гаспадарсьцьвенасьці й па-кінула насьледкі, якіх мы ня можам пазбыцца яшчэ сяньня.

KAMUNIKAT.org